Верныя справе ксяндза Булькі

Паветраны ас Сяргей Грыцавец

Адзін дзень... з міліцыяй

СТАР. 3 СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

16 ВЕРАСНЯ 2015 г. СЕРАДА № 177 (28035) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НА ВАРЦЕ АГУЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

Беларусь пацвярджае прыхільнасць мэтам і прынцыпам АДКБ

Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы патрабуе ўмацавання ваеннай моцы і механізмаў крызіснага рэагавання. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА ў Душанбэ на пленарным пасяджэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Фота БЕЛТА.

На думку Прэзідэнта Беларусі, паскараючы працу над Стратэгіяй калектыўнай бяспекі, АДКБ зможа забяспечыць фарміраванне адзіных поглядаў на абарону сваіх інтарэсаў. «Укараненне агульных стандартаў абароннай прадукцыі, аснашчэнне воінскіх кантынгентаў АДКБ уніфікаваным узбраеннем і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем дазволяць значна ўмацаваць ваенны патэнцыял арганізацыі», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён са шкадаваннем заўважыў, што па гэтых пытаннях у апошні час «мы шмат гаворым, але мала чаго зрабілі». Аляксандр Лукашэнка лічыць, што кіраўнікі дзяржаў павінны няўхільна і бездакорна выканаць абавязацельствы, узятыя на сябе ў гэтай частцы, асабліва што датычыць аснашчэння.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што патрэбны і прадуманыя дыпламатычныя захады. Паводле яго слоў, пашырэнне ўзаемадзеяння з вядучымі рэгіянальнымі і міжнароднымі структурамі па бяспецы павінна быць адным з асноўных сродкаў у нарошчванні патэнцыялу АДКБ як аўтарытэтнай арганізацыі, у павышэнні ўзроўню даверу і зніжэнні напружанасці ў рэгіёне і цэлым свеце.

У час сустрэчы ў вузкім складзе прэзідэнты комплексна разгледзелі найбольш важныя напрамкі развіцця АДКБ і адкарэктавалі планы працы на будучыню.

«Мы дамовіліся, што, калі трэба, падкарэктуем у найбліжэйшы час нашы статутныя дакументы і аптымізуем нашу арганізацыю. Прычынай таму сітуацыя, якая абвастраецца на межах вакол дзяржаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Гэтая арганізацыя становіцца самай запатрабаванай арганізацыяй на постсавецкай прасторы», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, агульнымі для ўсіх краін-саюзнікаў застаюцца знешнія рызыкі і пагрозы. «Выклікаюць насцярожанасць узровень экстрэмізму, які расце, уплыў міжнародных тэрарыстычных груповак. Сёння мы сутыкаемся з эскалацыяй напружанасці ў зонах тлеючых канфліктаў, адкрытымі ваеннымі дзеяннямі і з'яўленнем новых ачагоў нестабільнасці, у тым ліку каля нашых межаў. Як наступства гэтага — гібель людзей, разбурэнне дзяржаў, збяднення народаў і беспрэцэдэнтныя патокі бежанцаў і нелегальных мігрантаў», — канстатаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі пажадаў поспехаў Арменіі, якая прымае эстафету старшынства ў арганізацыі, і пацвердзіў прыхільнасць Беларусі мэтам і прынцыпам Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Парадак дня пасяджэння налічваў паўтара дзясятка пытанняў.

Аляксандр Лукашэнка таксама прыняў удзел у афіцыйным прыёме ад імя Прэзідэнта Таджыкістана Эмамалі Рахмона ў гонар удзельнікаў сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ.

А напярэдадні беларускі лідар меў размову з кіраўніком Таджыкістана ў ходзе двухбаковай сустрэчы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў вялікую працавітасць таджыкскага народа і падкрэсліў, што наша краіна гатова прыйсці на дапамогу ў любую хвіліну. Ён адзначыў, што закрытых тэм у беларуска-таджыкскіх адносінах няма. Беларусь адкрытая да развіцця ўзаемадзеяння па шырокіх спектрах: ад прамысловасці і сельскай гаспадаркі да абараназдольнасці.

Ураджайная фізкультура

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пяцікласнікі Каменскай сярэдняй школы Валожынскага раёна Аляксандр Казлоўскі і Іван Зелянкоў радуюцца сабранаму ўраджаю гарбузоў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, віцэ-прэм'ер:

«За апошні год статус педагога ў краіне значна вырас. Вынікі сёлетняй прыёмнай кампаніі сведчаць, што сярод абітурыентаў павысілася папулярнасць педагагічных спецыяльнасцяў, конкурс быў даволі высокі. З улікам таго, што наша краіна мінула дэмаграфічную яму і з кожным годам будзе расці нараджальнасць, колькасць школьнікаў таксама з кожным годам будзе ўзрастаць. Відавочна, што гэты факт патрабуе павелічэння колькасці педагагічных работнікаў. Трэба зрабіць усё, каб педагогі адчувалі сваю абароненасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Але без дапамогі саміх настаўнікаў у гэтым пытанні не абысціся. Ад саміх спецыялістаў таксама залежыць шмат што — працаваць ў школе павінен толькі той, хто паважае і любіць сваю прафесію».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.09.2015 г.

Долар ЗША	17762,00	▼
Еўра	20067,00	▼
Рас. руб.	264,17	▲
Укр. грыўня	806,45	▼

Сумесны праект "Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ

ШКОЛА З «ПАЖАРНЫМ» НУМАРАМ

Як ва ўстанове адукацыі тушылі полымя

Спакойнай раніцай цішыню двароў сталічнай Чыжоўкі раптоўна прарэзаў надрыўны гук сірэны. Да сярэдняй школы №112 падкацілі дзве аўтацыстэрны. З адных дзвярэй валіў дым. Ратаўнікі ў экіпіроўцы пайшлі ў будынак...

Тым часам праз парадны ход і эвакуацыйныя выхады настаўнікі выводзілі калонамі дзяцей і збіраліся непадалёк ад школы на стадыёне. Пералічыўшы вучняў, нехта з класных кіраўнікоў дакладвае: «Згубілі адно дзіця!». І праз хвіліну-паўтары ў праёме расчыненых насцеж дзвярэй з'явіўся адзін з ратаўнікоў. На руках ён нёс загорнутага ў коўдру хлопчыка васьмі-дзевяці гадоў. Апусціўшы малога на зямлю, яга пачалі аглядаць, ці ўсё з ім у парадку.

— Усе збеглі, а я разгубіўся, — казаў вучань другога «В» Цімафей КРАЙКО. — Застаўся ў нейкім памяшканні, а пасля мяне там знайшлі. Надзелі маску і вынеслі на свежае паветра...

Гэтае здарэнне не трэба шукаць на стужках інфармацыйных агенцтваў. Бо яго... не было. Справа ў тым, што ў корпусе, у якім займаюцца вучні малодшых класаў, ратаўнікі правялі максімальна рэалістычныя вучэнні. Прысвечаны яны рэспубліканскай прафілактычнай акцыі «У цэнтры ўвагі — дзеці», другі этап якой завяршыўся ўчора.

— Мы абралі для вучэнняў гэтую школу не проста так, — гаворыць **начальнік цэнтра прапаганады і сацыякультурнай дзейнасці Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Павел ФІЛІМОНАЎ.** — Па-першае, на выбар паўплываў яе нумар. Ужо трэці год у Беларусі датэлефанавацца да службы выратавання можна ў тым ліку і па дадатковым нумары 112. Ён жа «зашыты» і ў памяць практычна ўсіх мабільных тэлефонаў. Таму вучні гэтай школы дакладна ведаюць, як жа можна даклікацца да ратаўнікоў.

СТАР. 4

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

■ Факт

АМАЛЬ СТО ЛАМБАРДАЎ

Гэтымі днямі фінансавы рэгулятар краіны ўключыў яшчэ дзве юрыдычныя асобы ў рэестр мікрафінансавых арганізацый. Цяпер новымі арганізацыямі па прыцягненні і прадастаўленні пазык сталі акцыянерныя таварыствы «Русель» і «Еўраплацінум», якім былі прысвоены адпаведныя ідэнтыфікацыйныя коды.

Увогуле, паводле інфармацыі прэс-службы Нацыянальнага банка краіны, сёлета на 11 верасня ў рэестры мікрафінансавых арганізацый знаходзіцца 102 юрыдычныя асобы, у тым ліку 95 ламбардаў, 5 спажывецкіх кааператываў і 2 мясцовыя фонды. Агульная колькасць пунктаў па прадастаўленні пазык, унесеных у рэестр мікрафінансавых арганізацый, склала 317 адзінак, больш за трэць з іх тэрытарыяльна размешчаны ў сталіцы і Мінскай вобласці.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Увядзенне кантролю ўнутры Шэнгена не адаб'ецца на турыстах

Часовае ўвядзенне пашпартнага кантролю на межах Германіі і Аўстрыі не адаб'ецца на перамяшчэнні асоб з дзейнымі шэнгенскімі візамі, акрамя магчымых чэргаў пры перасячэнні мяжы. Пра гэта заявілі ў прэс-службе Еўракамісіі. «Фізічная асоба, якая мае дзейную шэнгенскую візу, зможа бесперашкодна і неабмежаваную колькасць разоў перасякаць межы ўнутры Шэнгена, дзе адноўлены часовы пашпартны кантроль у сувязі з экстраннай міграцыйнай сітуацыяй», — паведамілі ў ЕК. У той жа час ЕК прызнае, што на некаторых пунктах перасячэння мяжы могуць узнікаць лагістычныя складанасці, звязаныя са з'яўленнем пэўнага часу чакання з-за неабходнасці праходжання працэдуры кантролю. Іншымі словамі — будуць узнікаць чэргі. Як паведаміла афіцыйная прадстаўніца Еўракамісіі Наташа Берто, максімальна дапушчальны тэрмін увядзення часовага кантролю межаў у Шэнгенскай зоне складае два месяцы.

Нафту чакае «доўгая зіма» з коштам у раёне 35 долараў

Перыяд нізкіх цэн на энергарэсурсы можа працягнуцца доўгія гады, і часам нафтавыя каціроўкі будуць апускацца ніжэй за адзнаку ў 35 долараў за барэль. Пра гэта расказаў агенцтву Bloomberg кіраўнік амерыканскага фінансавага канглмерату Morgan Stanley Ручыр Шарма. «Варта рыхтавацца да доўгай зімы на сыравінных рынках», — папярэдзіў эксперт. Паводле яго слоў, 200-гадовая гісторыя нафтавай галіны сведчыць: кошты на нафту растуць на працягу прыкладна дзесяці гадоў, а потым яны дваццаць гадоў падаюць. Таму і цяпер стварэнне перапрацоўчых магутнасцяў, здольных «згенераваць» высокія цэны на сыравіну, зойме доўгія гады. Акрамя таго, на нафтавыя каціроўкі моцна цісне празмернасць прапановы, якая і прывядзе, па словах эксперта, да скарачэння коштаў да 35 долараў.

Наступныя два гады ў свеце будуць самымі гарачымі

Брытанская метэаралагічная служба лічыць, што найбліжэйшыя два гады стануць самымі гарачымі для планеты, піша BBC. У 2015 годзе сярэдняя тэмпература была вышэйшай за звычайныя паказчыкі на 0,68 градуса па Цэльсію. Кіраўнік брытанскай метэаслужбы прафесар Стывен Белчар лічыць, што звычайныя прыродныя з'явы, натуральна, уплываюць на клімат, але несумненна і тое, што павышэнне тэмпературы на планеце звязана з парніковым эфектам, выкліканым высокай колькасцю шкодных газаў у атмасферы. Метэаролагі пры гэтым мяркуюць, што наступнае дзесяцігоддзе стане больш халодным і сухім у летні час для Еўропы — з-за пахаладання ў Атлантыцы.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Лішак сну небяспечны, як і недасып

Дарослыя людзі, якія недасыпаюць або спяць занадта многа, сутыкаюцца з зацвярдзеннем артэрый, папярэджваюць медыкі. Паводле іх слоў, гэта першыя прыкметы хваробы сэрца. Як перадае Business Standard, неадэкватная колькасць гадзін сну або нізкая яго якасць назіраецца прыкладна ў 1/3 — 1/4 насельніцтва Зямлі. Спецыялісты даследавалі больш за 47 тыс. чалавек. Тыя, хто недасыпаў, мелі на 50% больш кальцыю ў каранарных артэрыях у параўнанні з людзьмі, якія спалі па 7 гадзін. Тыя, хто спаў зашмат, — на 70% больш кальцыевых адкладанняў. А чым больш адкладанняў, якія зніжаюць эластычнасць сасудаў, тым вышэйшая рызыка сардэчнага прыступу. Дарэчы, у групе тых, хто недасыпаў, часцей траплялася людзі з дэпрэсіяй, дыябетам 2-го тыпу або курцы.

КАРАТКА

Расійскі рэжысёр Вадзім Абдрашытаў стане старшынёй журы асноўнага конкурсу іграва кіно XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Пастаянная экспазіцыя Гарадской мастацкай галерэі народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, кавалера ордэна Францыска Скарыны, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Леаніда Шчамялёва адкрылася ў Верхнім горадзе ў Мінску.

IV форум маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню. Журналістыка: выбар маладых» пройдзе ў Мінску 22-23 верасня.

У Беларусі камп'ютарызавана 76% публічных бібліятэк, прычым яшчэ ў 2010 годзе гэты паказчык складаў толькі крыху больш за 40%.

Учора ў Асіповічах адбылася ўрачыстая цырымонія закладкі капсулы з пасланнем нашчадкам у фундамент спартыўна-аздараўляльнага комплексу, які будзе тут пабудаваны.

■ Вострае пытанне

ПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ,

каб сітуацыя з мігрантамі ў Еўропе не стала характэрнай і для нас

Сёння праблемы, звязаныя з мігрантамі, больш чым актуальныя для краін Еўрапейскага саюза. Ад навін пра тое, як імкнуцца перасяленцы з Паўночнай Афрыкі, Блізкага Усходу дабрацца да Еўропы — на лодках кантрабандыстаў, рызыкуючы жыццём, — становіцца не па сабе. Па звестках агенцтва Еўрапейскага саюза па бяспецы знешніх межаў Frontex, са студзеня па ліпень гэтага года зафіксавана каля 340 тысяч вымушаных перасяленцаў, якія прыбывалі як з вышэйназваных рэгіёнаў, так і з Украіны. Як вядома, з суседняй краіны за апошні год да нас таксама ў пошуках мірнага неба і магчымасці спакойна працаваць прыехала шмат людзей. Аднак, на шчасце, тая сітуацыя, што цяпер склалася ў Венгрыі, для нас не характэрна.

На днях па ініцыятыве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і падтрымцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на факультэце міжнародных адносін БДУ прайшоў «круглы стол» па пытаннях вымушанай міграцыі. Удзельнікамі яго сталі як парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў, так і дэлегаты міжнародных і грамадскіх аб'яднанняў, эксперты. На секцыях «круглага стала» абмяркоўвалася цяперашняя сітуацыя з вымушанай міграцыяй у свеце і ў нашай краіне, удзельнікі выказвалі свае думкі, пажаданні па ўдасканаленні айчыннага заканадаўства ў гэтай сферы.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

ПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ

ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ЎСЯГО

Аляксандр ТАТУРА, намеснік кіраўніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі — кіраўнік упраўлення знешняй працоўнай міграцыі, бежанцаў і прыстанішча Міністэрства ўнутраных спраў, заўважыў, што тэма вымушанай міграцыі сёння набывае асаблівую актуальнасць.

— Беларусь не стаіць убаку. Прыклад гэтаму — сённяшняе абмеркаванне цяперашняй сітуацыі ў сферы вымушанай міграцыі, прапаноў у галіне заканадаўства, якія былі ўнесены ў форме законапраекта Міністэрствам унутраных спраў у Савет Міністраў, Палату прадстаўнікоў.

Па словах прадстаўніка МУС, праца над законапраектам праводзілася планава.

— Асноўнымі распрацоўшчыкамі законапраекта з'яўляюцца Міністэрства ўнутраных спраў нашай краіны і Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў, — паведаміў ён. — Мяркуецца, што законапраект унясе шэраг змен у дзейнае заканадаўства. Гэта тычыцца, перш за ўсё, уніфікацыі працэдуры разгляду хадайніцтваў па прадастаўленні статусу бежанца ў нашай дзяржаве. Працэдура стане адзінай. Пры гэтым тэрмін разгляду хадайніцтва не будзе перавышаць шасці месяцаў. Акрамя таго, законапраектам мяркуецца прывесці шэраг артыкулаў дзейнага заканадаўства ў адпаведнасць з палажэннямі Канвенцыі 1951 года аб статусе бежанцаў. Дакумент вызначыць парадак рэагавання на масавае прыбыццё да нас асоб, што збіраюцца звярнуцца з хадайніцтвам аб прадастаўленні міжнароднай абароны.

Андрэй НАВУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, у сваю чаргу, паведаміў, што праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях вымушанай міграцыі» паступіў у яго камісію ў чэрвені 2015 года.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэты законапраект атрымаў вельмі вялікі рэзананс у грамадстве, яго вельмі актыўна абмяркоўваюць экспертныя колы, — падкрэсліў парламентарый. — Нагадаю, у жніўні адбылося мерапрыемства на базе Савета Рэспублікі, дзе ён абмяркоўваўся. Мэта цяперашняй сустрэчы — акумуляцыя як мага большай колькасці прапаноў, заўваг, якія маюць дачыненне да гэтага законапраекта. Заключным акордам будзе разгляд дакумента ў Авальнай зале.

Парламентарый таксама адзначыў, што заканадаўства, якое ў нас ёсць, адпавядае ўсім міжнародным нормам.

— Але рэальнасць патрабуе, каб мы ацанілі сітуацыю ў нашай краіне, падзеі ў Заходняй Еўропе і ў выніку выйшлі на той законапраект, які будзе адпавядаць патрабаванням нашага народа, — заявіў Андрэй Навумовіч.

КОЛЬКАСЦЬ БЕЖАНЦАЎ У КРАІНЕ РАСЦЕ

Што да бягучай сітуацыі з мігрантамі ў нас, то, па словах прадстаўніка МУС Аляксандра Татуры, захоўваецца тэндэнцыя павелічэння колькасці асоб, што звярнуліся з хадайніцтвам па прадастаўленні міжнароднай абароны на тэрыторыі нашай дзяржавы.

— Хачу падкрэсліць, што толькі сёлета на 1 верасня з хадайніцтвамі аб прадастаўленні міжнароднай абароны на тэрыторыі Беларусі ўжо звярнуліся 793 замежнікі, — сказаў ён. — Практычна мы ўжо набліжаемся да паказчыкаў па выніках усяго мінулага года — лічба дастаткова значная. Асобы, якія звярнуліся з хадайніцтвам аб абароне, як правіла, прыехалі з такіх краін, як Украіна — больш за 76%, Сірыя — каля 10% і Афганістана — каля 4%.

Аляксандр Татура таксама паведаміў, колькі ўсяго грамадзян Украіны прыехала ў Беларусь у гэтым годзе, — гэта прыкладна 52 тысячы чалавек.

— Яны прыехалі з розных прычын, не ўсе з іх збіраюцца хадайнічаць аб прадастаўленні міжнароднай абароны на тэрыторыі нашай краіны, — удакладніў выступоўца.

ПАТРЭБЕН ЗАПАСНЫ ПЛАН

Жак Ів БУШАРДЗІ, прадстаўнік Упраўлення вярхоўнага камісара па справах бежанцаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі, заўважыў, што нашай краіне, нягледзячы на перадавое заканадаўства ў сферы міграцыі, ёсць над чым працаваць.

— Неабходна, каб дапамога вымушаным перасяленцам аказвалася яшчэ больш эфектыўна. Напрыклад, некаторыя выхадцы з Украіны адчуваюць праблемы з працаўладкаваннем, маюць праблемы з пошукам месца пражывання.

Гаворачы аб міграцыйным крызісе ў Еўрасаюзе, ён адзначыў, што там маюць месца ажыўленыя дэбаты з нагоды таго, каго зваць бежанцам, а каго — мігрантам.

— Бежанцы — людзі, якія прыязджаюць і звяртаюцца па прадастаўленне абароны ў канкрэтна ўзятай дзяржаве, у той час як мігранты — тыя, хто прыязджае ў іншую дзяржаву, каб палепшыць свае ўмовы жыцця. У сувязі з сітуацыяй у Сірыі, Афганістане і іншых краінах кожная дзяржава павінна быць гатова да таго, каб сутыкнуцца з прыёмам вымушаных мігрантаў. Калі казаць аб выхадцах з Украіны, лічу, што Беларусь была добра падрыхтавана да прыезду вялікай колькасці грамадзян гэтай краіны.

Жак Ів Бушардзі падкрэсліў: «Тое, што цяпер адбываецца ў Еўрасаюзе — урок і для краін ЕС, і для іншых дзяржаў. Неабходна мець нейкі запасны план тэрміновых дзеянняў у выпадку масавага прыбыцця замежнікаў у канкрэтна ўзятыя дзяржавы. Гэта тычыцца ў тым ліку і Беларусі».

Кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў нашай краіне Зейнал ГАДЖЫЕЎ лічыць, што такі «круглы стол» вельмі своечасовы.

— Мінулыя месяцы паказваюць, што пытанні міграцыі патрабуюць увагі з боку ўсёй сусветнай супольнасці, — заявіў ён. — Рашэнне гэтых пытанняў вельмі няпростае. Знайсці яго ў кароткатэрміновай і нават у доўгатэрміновай перспектыве наўрад ці ўдасца. Добра, што Беларусі не характэрна тая крызісная сітуацыя з міграцыяй, якая склалася ў Еўропе. Тым не менш тут ёсць свае праблемы: востра стаіць пытанне змешанай міграцыі. Геаграфічнае становішча краіны абавязвае і ўрад, і грамадзянскую супольнасць надаваць значную ўвагу гэтаму. Міграцыя — гэта не толькі добраахвотнае перамяшчэнне людзей. Вельмі часта яно вымушанае.

ПЕРАСЯЛЕННЕ НАРОДАЎ ПАЧАЛОСЯ

Віктар ШАДУРСКІ, дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ, доктар гістарычных навук, прафесар, расказаў, што яго факультэт у прыватнасці і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у цэлым займаецца вывучэннем праблемы вымушанай міграцыі, бежанцаў з 1997 года.

— У нас ёсць вялікі вопыт, — адзначыў дэкан ФМА. — На нейкім этапе тэма міграцыі, бежанства была не характэрна для нашай краіны. Грамадзян, што атрымалі статус бежанца, у нас было няшмат, большасць з іх былі студэнтамі з Афганістана, Эфіопіі. Але мы бачым, што гэтая тэма набывае ўсё большую актуальнасць: украінскія грамадзяне прыязджаюць у Беларусь. Другая праблема — гэта, натуральна, вымушаная міграцыя ў дзяржавы Еўрапейскага саюза, якая, здавалася б, нас не датычыцца, але ў любы момант гэта праблема можа ў нас актуалізавацца.

Віктар Шадурскі выказаў думку, што створаная ў нас сістэма работы з бежанцамі прайшла пэўную праверку часам.

— Мы бачым, што няма ніякіх каталізмаў, нягледзячы на тое, што Беларусь прыняла дастаткова шмат грамадзян Украіны — прыкладна адзін працэнт у адносінах да ўсяго насельніцтва нашай краіны. Гэта вельмі шмат. Пакуль нейкіх праблем няма, але трэба працаваць на апярэджанне — у сферы заканадаўства ў тым ліку. Гэты «круглы стол» — прыклад супрацоўніцтва міжнародных арганізацый, дзяржавы, выканаўчай, заканадаўчай улады і грамадскіх аб'яднанняў, таму што менавіта грамадскі сектар вельмі актыўна ўдзельнічае ў гэтай працы.

Ці трэба баяцца, што ў будучыні ў нашай краіне можа скласціся такая ж сітуацыя з мігрантамі, якая сёння склалася ў многіх еўрапейскіх краінах?

— На маю думку, сусветныя тэндэнцыі праяўляць сябе і ў нас, — лічыць прафесар. — З павышэннем узроўню жыцця Беларусь будзе не проста краінай транзіту, а краінай прызначэння. Такія выпадкі ўжо мелі месца, і мы павінны быць гатовы да гэтага. Перш за ўсё трэба, каб вырашаліся пытанні пражывання, працаўладкавання, сацыяльнай арганізацыі. Ёсць магчымасць улічваць вопыт замежных краін — маю на ўвазе краіны Еўрапейскага саюза, — якія, на нашу думку, аказаліся не падрыхтаванымі да такога наплыву. Хоць, відаць, такога трэба было чакаць. Натуральна, людзі будуць шукаць лепшай долі і імкнуцца выратаваць сваё жыццё. Трэба ўлічваць гэты вопыт. Мне здаецца, вялікае перасяленне народаў ужо пачалося, і Беларусь наўрад ці застанецца ўбаку ад гэтых працэсаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
на право заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта:
«Мини-рынок по ул. Центральной в г. Смолевичи Минской области»

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 20.10.2015 г. в 11.00
3	**Продавец и его адрес**	г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот №1 – площадь 0,0652 га, кадастровый номер 624850100001000930 «Мини-рынок по ул. Центральной в г. Смолевичи Минской области»
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства объекта «Мини-рынок по ул. Центральной в г. Смолевичи Минской области»
7	**Сроки аренды**	Лот № 1 – 99(девяноста девять) лет
8	**Начальная стартовая цена**	Лот № 1 – 60 000 000 рублей
9	**Условия аукциона**	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица
10	**Наличие инженерной инфраструктуры**	Лот № 1 – имеется водоснабжение, теплоснабжение, газоснабжение, централизованное водоотведение
11	**Условия оплаты**	За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона
12	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002. (с пометкой «задаток за земельный участок»)
13	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком**	Каждый четверг с 9.00 до 13.00
14	**Окончательный срок приема заявлений**	14.10.2015 г. – 17.00

Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.

Окончательный срок приема заявлений – 04.09.2015 г. 17.00.

Контактные телефоны: (8-01776) 5-52-65, (8-01776) 5-53-42.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

■ Форум рэгіёнаў

УПАКОВАЧНАЯ ПЛЁНКА СТАНЕ ЯДОМАЙ?

У межах другога Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Сочы 17-18 верасня адбудзецца выстава вытворцаў, дзе вядучыя беларускія кампаніі прэзентуюць перспектыўныя ўзоры інавацыйнай прадукцыі.

Паводле інфармацыі прэс-службы Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, якая разам з УП «Белінтэрэкспа» з'яўляецца арганізатарам выставы, сёлета ў Сочы свой прамысловы патэнцыял прадэманструюць 97 удзельнікаў беларускай экспазіцыі, што прадстаўляюць розныя галіны эканомікі.

Асноўнымі задачамі мерапрыемства стане развіццё кааперацыі паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі нашых краін, рэалізацыя сумесных праектаў у рамках Саюзнай дзяржавы, у тым ліку ў межах рэалізацыі праграм імпартазамяшчэння, прэзентацыя гандлёва-эканамічнага патэнцыялу Беларусі дзелавым колам і кіраўнікам рэгіёнаў Расіі.

На мерапрыемстве арганізаваны тэматычныя экспазіцыі інвестыцыйных і экспартных магчымасцяў нашай краіны, навуковых дасягненняў, прамысловай прадукцыі, прадпрыемстваў нафтахімічнай галіны, прадукцыі ваеннага прызначэння, дрэваапрацоўчай галіны, тавараў для насельніцтва, прадукцыі спажывецкай кааперацыі, прадпрыемстваў аховы здароўя, а таксама стэнд Міністэрства інфармацыі.

Найбольш перспектыўныя ўзоры інавацыйнай прадукцыі на выставе вытворцаў з беларускага боку дэманструюцца па чатырох напрамках. На стэндзе Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях будзе паказана новая бесплатформавая навігацыйная сістэма для вызначэння бягучых каардынат прывязкі аб'екта; доследныя ўзоры высокаэфектыўных магутных крыніц сілкавання шырокага прымянення, якія маюць убудаваны мікрапрацэсар і забяспечаны сістэмай лічбавага дыстанцыйнага кіравання; а таксама ўзоры першых ядомых плёнак, зробленых на аснове крухмалу.

Міністэрства прамысловасці прэзентуе на выставе натурны ўзор панарамнага ліфта без машыннага аддзялення; зборкі фотаадчувальных матрыц для касмічнай апаратуры; поўнапрывадныя самазвалы «МАЗ» і «БелАЗ»; газавы аўтобус «МАЗ» і іншыя машыны і абсталяванне. На стэндзе Дзяржкамваенпрама будуць паказаны макет оптыка-электроннай здымачнай апаратуры з высокай дзялільнай здольнасцю для касмічных апаратаў, нашлемная сістэма індыкацыі і амфібійны катар на паветранай падушцы.

Канцэрн «Белнафтахіма» прапануе наведвальнікам выставы базальтавае бесперапыннае валакно і прадукцыю на яго аснове, ніткі поліэфірныя тэкстыльныя, вугляродныя валокны і тэрмаўстойлівыя матэрыялы.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

ЭКАНАМІЧНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

чакаюць беларускія прадпрыемствы на сочынскіх перамовах

«Ужо падрыхтавана каля 100 кантрактаў на суму болей за 100 мільёнаў долараў. Хоць гэтая лічба прыблізная і можа павялічыцца», — заявіў Анатоль РУСЕЦКІ, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі напярэдадні адкрыцця Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пачне сваю працу заўтра ў Сочы.

Па яго словах, у пасяджэннях падчас форуму возьмуць удзел кіруючыя асобы ад рэгіёнаў Расіі і абласцей Беларусі. «Тут можна назваць рэспублікі — Удмурція і Карэлія, краі — Камчацкі, Краснадарскі, Хабараўскі, вобласці — Архангельская, Уладзімірская, Валагодская, Белгародская, Бранская, Калужская. А таксама гарады Масква і Севастопаль», — удакладніў ён і дадаў, што гэтыя суб'екты Расійскай Федэрацыі з'яўляюцца аднымі з асноўных для нашай краіны партнёраў, але толькі імі супрацоўніцтва не абмяжоўваецца. Важна, што ўдзел у мерапрыемстве бяруць старшыні і ўдзельнікі заканадаўчых сходаў каля 40 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. «Па выніках нашага форуму мы прымем дакумент, які павінен вызначыць на пэўны прамежак часу кірункі працы парламента — у гэтым выпадку Савета Федэрацыі Расіі і Савета Рэспублікі Беларусі. Будуць дадзены рэкамендацыі і выканаўчай уладзе па выкананні прамысловай палітыкі», — паведаміў віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента.

«Мы плануем, што ў межах Саюзнай дзяржавы ў найбліжэйшы час будзе прыняты план рэалізацыі структурнай прамысловай палітыкі. І адным з напрамкаў яго з'яўляецца рэалізацыя саюзных праграм», — сказаў сенатар. У той жа час у Гродне таксама быў падпісаны дакумент, які вызначае асноўныя напрамкі прамысловай палітыкі ў Еўразійскім эканамічным саюзе: «Гэтыя дакументы, дапаўняючы адзін аднаго, павінны дапамагчы рэалізацыі тых задач, якія былі пастаўлены падчас стварэння ЕАЭС. А гэта — свабодны рух тавараў, зняцце бар'ераў, роўны доступ усіх прадпрыемстваў да дзяржаўных закупак».

Парламентарый прызнаецца, што цяпер найперш важна вырашыць пытанні ўніфікацыі і аднастайнасці падтрымкі вытворцаў, абароны ўнутранага рынку, айчынных вытворчасцяў, імпартазамяшчэння. «У любым выпадку мы павінны казаць пра стварэнне новай, канкурэнтаздольнай прадукцыі, якая будзе выпускацца ў такіх аб'ёмах, якія былі б дастатковыя для задавальнення патрэб нашага рынку і рэалізацыі на экспарт», — лічыць Анатоль Русецкі.

Для парламентарыяў найважнейшай тэмай застаецца гарманізацыя заканадаўства.

«Мы ведаем, што, уступіўшы ў ЕАЭС, абавязаны прывесці нашы законы ў адпаведнасць з падпісаным пагадненнем», — кажа намеснік старшыні Савета Рэспублікі. Па яго словах, вызначаны шэраг законапраектаў, якія плануецца прыняць ужо сёлета. А што тычыцца Форуму рэгіёнаў, то гэта — выдатная магчымасць, каб абмеркаваць «увесь комплекс пытанняў», у тым ліку праблемы, якія існуюць у рэальным сектары эканомікі і нарматыўна-прававым забеспячэнні дзейнасці прадпрыемстваў. «Мы лічым, што дастаткова эфектыўна зможам абмеркаваць іх у Сочы. З улікам таго, што прадстаўніцтва будзе высокае», — падсумаваў сенатар.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Навука без межаў

СЯБРУЕМ І Ў КОСМАСЕ

Беларускія і расійскія навукоўцы працуюць над новым касмічным апаратам

Міжнародная навуковая канферэнцыя «Фізіка плазмы і плазменныя тэхналогіі» праходзіць гэтымі днямі ў Нацыянальнай акадэміі навук. Сярод удзельнікаў форуму — навукоўцы амаль з 15 краін блізкага і далёкага замежжа. Асабліва яскрава мерапрыемства сведчыць пра шчыльнае супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх вучоных — на канферэнцыю завітаў і прэзідэнт Расійскай акадэміі навук Уладзімір ФОРТАЎ, для якога гэты візіт стаў першым на пасадзе кіраўніка РАН.

Ганаровы госць паўдзельнічаў у адкрыцці форуму, выступіў з дакладам, сустрэўся з вядучымі айчыннымі навукоўцамі, пазнаёміўся з выставай дасягненняў беларускай навукі і Музеем гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама правёў перамовы з кіраўніцтвам НАН Беларусі аб перспектывах навуковага супрацоўніцтва.

— Нацыянальная акадэмія навук Беларусі займае асаблівае месца сярод навуковых устаноў, якія працягваюць працаваць у постсавецкі час, — лічыць Уладзімір Фортаў. — Ёсць шэраг напрамкаў, па якіх беларускія вучоныя займаюць першыя месцы ў свеце. Цяпер вось праходзіць канферэнцыя па фізіцы плазмы. Беларусы яшчэ з часоў славутага Міхаіла Ельяшэвіча займалі ў гэтай сферы перадавыя пазіцыі. У 1950-я гады менавіта яны даследавалі эфекты ядзерных выбухаў. Моцная савецкая школа ў Беларусі захавалася, і цяпер тут сканцэнтраваны актуальныя распрацоўкі па гэтым напрамку. Зазначу, што сусветныя аб'ёмы продажу прадукцыі з выкарыстаннем плазмы складаюць прыкладна 3—4 трыльёны долараў, гэта каласальны рынак. Сфера ўжывання плазмы неверагодна шырокая, самы просты прыклад — плазменныя тэлевізары. Тое, што Беларусі ўдалося захаваць вытворчасць плазменных прыбораў і адначасова не страціць акадэмічнай навукі, уражвае. Пэўна, менавіта таму да вас сёння прыехалі вядучыя навукоўцы з усяго свету.

Як расказаў прэзідэнт РАН, супрацоўніцтва паміж беларускімі і расійскімі навукоўцамі вядзецца ў вялікай колькасці сфер. Сельская гаспадарка, медыцына, бія- і нанатэхналогіі — далёка не поўны ідэралік. У чэрвені ў Маскве адбылося сумеснае пасяджэнне прэзідыумаў РАН і НАН Беларусі, на якім вучоныя абмеркавалі планы працы на 2016—2020 гады.

— На маскоўскім пасяджэнні мы выбралі тры знакавыя праекты, якія будзем рэалізоўваць з расійскімі калегамі, — зазначыў **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**. — Адзін з іх — гэта суперкамп'ютар «Скіф», з якога мы калісьці толькі пачыналі сумесна працаваць. Ужо існуе некалькі пакаленняў гэтага апарата. Не менш важныя і касмічныя распрацоўкі, у прыватнасці стварэнне спадарожнікаў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Цяпер вядзецца сумесная праца над новым касмічным апаратам, больш дасканалым за папярэдні. Літаральна тыдзень таму быў падпісаны адпаведны дагавор. Калі ўсё будзе ісці па плане, плануем вывесці яго на арбіту ўжо ў 2017 годзе.

А яшчэ...

Беларускія і расійскія навукоўцы плануюць распрацаваць і запусціць на арбіту міжакадэмічны спадарожнік. Такі апарат можа быць дастаўлены ў касмічную прастору як дадатковая нагрузка для караблёў, што накіроўваюцца на Міжнародную касмічную станцыю. Адна з галоўных функцый такога спадарожніка — адукацыйная, бо ў яго стварэнні і працы змогуць прымаць удзел і маладыя навукоўцы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24**

Предмет аукциона

№ лота	Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Лот 1	Магазин № 31	Здание специализированное розничной торговли	268,3 кв.м	600/С-55537	Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большой Тростенец, магазин № 31.
Сведения о земельном участке:		площадь **0,1347 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.			

Начальная цена с НДС 20% – 1 600 000 000 белорусских рублей.

№ лота	Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Лот 2	Магазин №39	Здание специализированное розничной торговли	137,7 кв.м	600/С-139782	Минская обл., Минский р-н, Роговский с/с, д. Головачи, 2А
Сведения о земельном участке:		пл. **0,2038 га** предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 18.09.2032 для обслуживания здания магазина.			

Начальная цена с НДС 20% – 280 000 000 белорусских рублей.

№ лота	Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Лот 3	Магазин №53	Здание специализированное розничной торговли	68,1 кв.м	600/С-139976	Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, д. Гатовино, 17А
Сведения о земельном участке:		пл. **0,0311 га** предоставлен продавцу на праве аренды по 17.09.2032 для обслуживания здания магазина.			

Начальная цена с НДС 20% – 150 000 000 белорусских рублей.

№ лота	Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Лот 4	Магазин № 63	Здание специализированное розничной торговли	97,7 кв.м	600/С-136917	Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Великое Село
Сведения о земельном участке:		пл. **0,0768 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.12.2041 для обслуживания здания магазина с ограничением (водоохранная зона).			

Начальная цена с НДС 20% – 152 000 000 белорусских рублей.

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи:	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.08.2015 г.

Дата и время проведения аукциона	**07.10.2015 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Дата и время окончания приема документов	**05.10.2015 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактные данные	**Тел.: +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71, E-mail: auction@cpo.by, www.cpo.by.**

Ровенская товарная биржа
Украина, г. Ровно, ул. Драгоманова, 27, +380362620524, +380362620588

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества иностранного предприятия «Томашгородский КДЗ» с понижением начальной цены

Лот №1	Имущество ИП «Томашгородский КДЗ»	Украина, Ровенская обл., Рокитновский р-н, пгт. Томашгород, ул. Заводская, 3	**Начальная цена с НДС, доллары США**	**Задаток с НДС, доллары США**	**Шаг аукциона, %**
			360 000	36 000 (подлежит уплате в гривнах по курсу НацБанка Украины на дату платежа)	1

С перечнем объектов недвижимости, основных средств, малоценных необоротных материальных активов можно ознакомиться в извещениях, размещенных в газете «Звязда» от 14.03.2015, 11.04.2015, 20.05.2015, 06.08.2015, 02.09.2015

С информацией о земельном участке, условиями проведения аукциона, порядке и сроках перечисления гарантийного взноса (задатка) и его возврата, условиях участия в аукционе можно ознакомиться в извещении, размещенном в газете «Звязда» от 14.03.2015, от 11.04.2015, 20.05.2015,06.08.2015, 02.09.2015.

Аукцион состоится 28.09.2015 в 10.00 по адресу: ул. Заводская, 1, г. Фаниполь, Дзержинский р-н, Минская обл., Республика Беларусь, 222750. Помещение актового зала ОАО «Дорстройиндустрия».

Гарантийный взнос (задаток) перечисляется на р/с 26009705953117 в АТ Райффайзен банк «Аваль», г. Ровно, ул. С.Петлюры, 35, мфо 380805, Получатель – Ровенская товарная биржа, код ЄДРПОУ 23302583 (УНП). Назначение платежа: гарантийный взнос для участия в аукционе по продаже имущества иностранного предприятия «Томашгородский кдз» (Лот №1), **проводимом 28 сентября 2015 года.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.30 по адресу: Украина, г. Ровно, ул. Драгоманова, 27, помещение Ровенской товарной биржи.
Окончание приема заявлений и других необходимых документов – **23.09.2015 в 17.00.**
Заключительная регистрация участников **28.09.2015 с 09.30 до 10.00** по месту проведения аукциона.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Поляк Владимир Филиппович, +38050 434 45 58.

☎ **Организатор: +380362620524, +380362620588 • e-mail: rtb@rivne.com**

Открытое акционерное общество
«Дорожно-строительный трест № 5»
(г. Минск, ул. Широкая, 26)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 28 сентября 2015 года в 11 часов 00 минут ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 4 (конференц-зал).
Форма проведения собрания: очная.
Инициатор созыва: наблюдательный совет.
Основание созыва: решение наблюдательного совета.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении результатов проведения закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции Общества.
2. Об утверждении решения о выпуске дополнительных простых (обыкновенных) акций Общества.
3. Об увеличении размера уставного фонда Общества.
4. О внесении изменения в устав Общества.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 4, кабинет 12, по рабочим дням **с 17 сентября 2015 года по 25 сентября 2015 года с 8^{00} до 17^{00},** (понедельник–четверг) и с 8^{00} до 15^{45} (пятница–суббота), либо 28 сентября 2015 года по месту проведения собрания, тел. для справок: (017) 238 37 12, (024) 970 96 27.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание, состоится **28 сентября 2015 года с 09^{30} до 10^{45}** по месту проведения собрания. При себе иметь паспорт, представителю акционера иметь паспорт и доверенность акционера или договор.

Наблюдательный совет ОАО «ДСТ № 5»

УНП 100219908

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

16 верасня 2015 г. № 17 (357)

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

СЛОВА Ў АБАРОНУ СМЕЦЦЕПРАВОДА

Уважліва прачытаў артыкул Ірыны Асташкевіч «Ё-маё! А смецце чыё?..» («МС» за 12.08.15). Прачытаў і задумаўся: а з якой нагоды мясцовыя чыноўнікі выдаюць знішчэнне смецціправоддаў за новае слова ў вядзенні гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі?

Я лічу, што смецціправод — адна з найлепшых вынаходак у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, няхай сабе і «мінулага стагоддзя». Таму я не зайздрошчу гамяльчанам, якія, паводле слоў аўтара артыкула, ужо некалькі гадоў жывуць без яго.

Узнікае пытанне: каму канкрэтна моцна перашкаджаюць смецціправоды? Жыхарам шматпавярховак? Магчыма, але толькі тым, хто не прывык захоўваць парадак. А вось гаспадарам тых кватэр, якія дамовіліся сачыць за чысцінёй вакол смецціправоду, гэтая зручнасць даспадобы. Бо, як вядома, чыста там, дзе не смецяць. Яшчэ больш за 20 гадоў таму мы, жыхары шасці кватэр, дамовіліся падтрымліваць парадак на нашай пляцоўцы ўвогуле і вакол смецціправода ў прыватнасці. Каля яго заўсёды мяцёлка і савок — на ўсялякі выпадак. Калі нешта высыпалася з вядра ці пакета на падлогу, можна хутка прыбраць. Нас усіх задавальняе наяўнасць смецціправода ў доме. Таму з адмоўнымі наступствамі кшталту «водар гніення і хлоркі, прускоў і пацукоў, пажары ад недакуркаў і грукат сярод ночы» мы не сутыкаемся. А калі нешта падобнае здараецца, то гэта ўсё роўна не перакрэслівае ўсе перавагі смецціправода.

Аўтар вышэйназванага артыкула піша, што ёсць разлікі, згодна з якімі выключэнне смецціправодаў з праектаў дамоў дапаможа зменшыць кошт іх будаўніцтва. Зразумела. Але ж гэта эканомія — супраць камфорту людзей. Калі выключыць з праектаў, скажам, ліфты, то атрымалася б яшчэ большая эканомія? А чаму б не паспрабаваць эканоміць на зніжэнні кошту праектаў, сабекошту будаўнічых матэрыялаў, павышэнні якасці работ, паскарэнні ўводу аб'ектаў жылля і г. д. Не, лепш пазбавіць насельніцтва выгоды, якая жыццёва неабходна, скажам, людзям з абмежаванымі магчымасцямі, хворым сталым, нямоглым, якія без дапамогі іншых не могуць пакінуць кватэру. Мяркую па сваёй 90-гадовай маці. Па стане здароўя яна не выходзіць з дому. Усё неабходнае ёй прыносім мы. Але наведваем не кожны дзень. Для маці вельмі зручна пазбаўляцца адходаў праз смецціправод. Між іншым, непатрэбную паперу, тару з пластыку мы выносім у кантэйнеры.

Ёсць у мяне моцнае падазрэнне, што ў ліквідацыі смецціправодаў у першую чаргу зацікаўлены работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Замінае ім эксплуатацыя гэтай «вынаходкі», вось і вырашылі спрасціць сабе жыццё. Як вынікае з артыкула, сёння ў Гомелі робіцца стаўка на шырокае ўкараненне еўракантэйнераў, дзе кожны запаўняецца, заўважце, не смеццем, а другаснай сыравінай: паперай, плыстыкавымі бутэлькамі, шклом. Наконт апошняга ёсць сур'ёзная заўвага. Цікава, якім чынам яно перарабляецца? У артыкуле ёсць спасылка на багаты замежны (а канкрэтна еўрапейскі) досвед. Калі так, спашлюся і я на яго. Шкло ад бутэлек у цывілізаваных краінах Еўропы збіраецца не проста асобна, а сартуецца ў розныя кантэйнеры: для белага шкла, зялёнага і шкла колеру ёду. Кожны колер такой шкляной сыравіны ідзе на выраб пэўнай прадукцыі. А ў нас шкло ўсіх колераў збіраецца ў адзін кантэйнер. Чаму? З якіх мэт?

І яшчэ адзін факт з замежнай практыкі барацьбы з засмечваннем гарадоў. Падчас шматлікіх сацыялагічных вывучэнняў еўрапейскія даследчыкі прыйшлі да высновы: як ні заклікай насельніцтва быць акуратным, не смеціць у доме і вакол свайго жылля, а таксама на прыродзе, як ні павялічвай на тэлебачанні аб'ёмы спецыяльнай сацыяльнай рэкламы на гэтую тэму, усё роўна ад 10 да 15 працэнтаў людзей будуць смеціць вакол сабе. Думаю, што і ў нас прыкладна такі працэнт, а можа і большы, непераконваемых людзей. Адзіны сродак іх утаймавання — жорсткі кантроль з боку мясцовай улады за захаваннем парадку на падведамаснай тэрыторыі і адчувальныя штрафы за забруджванне навакольнага асяроддзя.

Слова «смецце» — гэта з лексікону савецкіх часоў, калі танны да смешнага бензін у велізарных аб'ёмах выліваўся паабапал дарог, вада з водаправода ніяк не ўлічвалася, страты ад яе бяздумнага выкарыстання клаліся на, як тады ўяўлялася, бязмежны дзяржаўны бюджэт, а даходы тупа складзіравалі на спецыяльных палігонах. Сёння «смецце» ўсё больш асацыіруецца з другаснай сыравінай. Таму на пытанне «а смецце чыё?..» адказ просты — наша. Закопваць у кар'ерах сотні тон гарадскіх бытавых адходаў і небяспечна, і не па-гаспадарску. Як па-гаспадарску? Павучымся ў кітайцаў. Яны набываюць велізарныя аб'ёмы другаснай сыравіны ў ЗША, перарабляюць яе і потым вязуць у Амерыку гатовыя рэчы...

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ЖЫЦЬ ПРЫГОЖА

ВЫСОКАЕ — ЯШЧЭ ВЫШЭЙ

Як выконваецца праграма развіцця самага заходняга горада Беларусі

Мікалай САЧЫК і гараджанка Аксана ІВАНОВА.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Вельмі вобразна патлумачыў прычыну адставання ў добраўпарадкаванні большасці былых райцэнтраў старшыня Высокаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай САЧЫК: «Вы сабе ў кватэру, скажам, новы стол купілі, а таксама новыя шафу, канапу, а старыя — куды? На дачу, вядома. Прыкладна гэтак жа доўгі час абыходзіліся і з нашымі гарадамі, пасёлкамі, што перайшлі ў раённае падпарадкаванне. Усе найлепшыя кавалкі, і найперш фінансавыя, ішлі ў райцэнтр, а нам ужо даставалася тое, што заставалася».

Звярніце на нас увагу!

І сапраўды, гаспадарка былых райцэнтраў фінансавалася калі не зусім па астаткавым прынцыпе, то вельмі сціпла. А гэта не надта справядліва. Таму што большасць былых мястэчкаў па-ранейшаму засталіся немалымі гарадкамі альбо пасёлкамі, акрамя таго, яны захавалі ў сабе тую мілую правінцыяльнасць і свае адметнасці, ад якіх райцэнтры паспяшаліся пазбавіцца. Праўда, апошнім часам рукі ў мясцовай улады ўсё ж дайшлі і да гэтых гарадкоў. Яны прыкметна папрыгажэлі і абнавіліся. Напрыклад, у Ружаны за мінулую пяцігодку ўкладзены немалыя сродкі. А вось з Высокім у Камянецкім раёне было не так. Таму людзі і скардзіліся ў розныя інстанцыі, пісалі лісты ў аблвыканкам. Быў час, калі высакаўчане пачалі збіраць подпісы за далучэнне іх горада да Брэсцкага раёна. Яны меркавалі, што ў прыгарадным раёне на іх звернуць большую ўвагу. Тады прайшлі сходы грамадзян з удзелам кіраўнікоў абласной і раённай улады. І на ўзроўні вобласці быў распрацаваны план мерапрыемстваў, які можна назваць праграмай развіцця горада на 2013-2015 гады. А пад праграму, вядома, выдзелілі сродкі.

Не ўсё адразу

Сёння можна сказаць, што зроблена многае. І вянцом усіх агульных намаганняў стала школа. Яна сустрэла вучняў першага верасня літаральна непазнавальнай. У мясцовай установе адукацыі праведзены рэканструкцыя і капітальны рамонт. Зараз школай ганарацца жыхары горада, нават тыя, у каго дзеці выраслі. Бо навучальная ўстанова стала ўпрыгажэннем самага заходняга гарадка нашай краіны. Варта адзначыць, што на школу сродкі пайшлі як з абласнога, так і з раённага бюджэтаў.

Па згаданай вышэй праграме добраўпарадкавалі вуліцы Леніна, Савецкую. Тут пракладзены не толькі новы асфальт, але і тратуары. Дарэчы, цікавую падрабязнасць расказаў Мікалай Сачык падчас экскурсіі па Высокім. Калі не было тратуара на адной з вуліц, то ў органы ўлады з гэтай нагоды паступіла адна скарга, а калі яго праклалі, то напісалі ажно чатыры звароты. Аўтарамі іх сталі жыхары суседніх вуліц і завулкаў, бо яны хацелі, каб гэтак жа зрабілі і ў іх. «Яно і зразумела, — пагаджаецца высокаўскі мэр, — усім хочацца жыць прыгожа і зручна. Але ж за адзін раз не зробіш так па ўсім горадзе. Даводзіцца зноў і зноў тлумачыць людзям, што грошы ўкладваюцца ў першачарговыя аб'екты». Вось, напрыклад, па вуліцы Будаўнікоў вядзецца цеплавая рэабілітацыя дамоў. У выніку яе тыпавыя панэльныя шматпавярхоўкі становяцца больш прывабнымі, сцены фарбуюцца ў светлыя колеры. Адначасова прыводзяцца ў парадак дваровыя тэрыторыі, дзіцячыя пляцоўкі. Такім чынам жылы квартал набывае сучасныя абрысы.

Многа зроблена такога, што не адразу і заўважыш, але без чаго важныя для горада сацыяльныя аб'екты пачувалі б сябе нашмат горш. Ну, напрыклад, у гарадскім Доме культуры праведзены капітальны рамонт даху. Мадэрнізаваны дах тэрапеўтычнага корпуса бальніцы. Такая ж работа праведзена і ў будынку дзіцячага садка. Тут яшчэ замянілі вокны і дзверы. Хаця па дзіцячай дашкольнай установе ўдалося зрабіць не ўсё, што планавалі.

Той, хто даўно не быў у Высокім, адзначыць, што зусім новае аблічча набыў галоўны гарадскі сквер. Ён быў закладзены адразу пасля вайны, і, вядома, даўно ўжо прыспела патрэба яго карэнным чынам змяніць. На гэтую работу пайшло каля шасці мільярдаў рублёў. Амаль усе дрэвы былі захаваны, але сквер стаў іншым. Цяпер вельмі прыемна гуляць па новых дарожках, сесці на прыгожую эксклюзіўную лаўку. Зручна адпачываць і сем'ям з малымі дзецьмі, для малых абсталявана пляцоўка.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Новая лесвіца ў парку.

І МЫ ТАМ БЫЛІ

ПЯЦЬ ГАДОЎ БЕЗ КСЯНДЗА БУЛЬКІ

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Летась знакамітаму Мосару споўнілася 500 гадоў. Гэтая вёска ў Глыбоцкім раёне з насельніцтвам усяго каля 250 чалавек стала вядомай у першую чаргу дзякуючы святару мясцовага касцёла Юозасу Бульку. Ужо 5 гадоў, як яго, на жаль, няма з намі. Сёлета паважанаму ксяндзу споўнілася б 90. І роўна 25 гадоў, як ён стаў ксяндзом у Мосары. Цяперашні ксёндз Марат працягвае справы папярэдніка. Разумее: тое, што зроблена Булькам, трэба не толькі захоўваць, але і развіваць далей.

Ксёндз Марат.

Спіртнога ў краме няма

Бульку ўспамінаюць добрым словам усе, у каго пытаўся пра яго яшчэ ў Глыбокім. Зразумела, што знайсці годную замену такому пробашчу было цяжка. Ксёндз Марат — трэці святар пасля Булькі ў Мосары.

— Вядома, што Булька многа чаго зрабіў для аднаўлення касцёла, упрыгожвання тэрыторыі вакол яго. Зразумела, што не кожны можа так актыўна стварацьпригажосць, змагацца за цвярозы лад жыцця. Пасля Булькі ксяндзом быў таксама ініцыятыўны, але вельмі малады чалавек. Потым яго замянілі на больш сталага. Але, шчыра кажучы, ён не вельмі добра разумеў, што касцёл у Мосары — гэта не толькі храм. Ён стаў і турыстычным аб'ектам, бо касцёл жа знаходзіцца на тэрыторыі культурна-дэндралагічнага комплексу. Акрамя скульптурных кампазіцый, нагадаю, там ёсць экзатычныя расліны, вальер для страусаў, іншых «братоў нашых меншых». А яшчэ можна ўбачыць Крыжовы шлях, антыалкагольны музей, Алею цвярозасці. Сабрана цікавая этнаграфічная калекцыя, — расказвае па дарозе ў Мосар **Уладзімір МІРОНЧЫК, навуковы супрацоўнік Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея.**

Нагадаю, што ў свой час ксёндз Юозас Булька ўпершыню ў краіне ініцыяваў забарону на продаж спіртнога ў Мосары. Вёска і цяпер безалкагольная. Праўда, у краме суседняй вёскі, да якой каля 3 кіламетраў, можна купіць усё...

І вось ён, Мосар. Колькі сюды ні прыязджаеш, не перастаеш здзіўляцца — як прыгожа! Аўтару гэтых радкоў пашанцавала ў пачатку 2000-х гадоў пазнаёміцца з самім ксяндзом. Мясцовыя жыхары прапанавалі паглядзець на цуд, і мы паехалі. Шаноўны ксёндз тады пацікавіўся, ці ёсць у мяне грэх — цяга да выпіўкі.

— Вы ж яшчэ малады, — звярнуўся ён да мяне. — Дык навошта вам наогул піць? Я вам усяго тры парады дам: не купляйце, не піце, не частуйце іншых! Пачніце — і вам спадабаецца!

На развітанне ён падарыў мне і калегам пластыкавыя статуэткі Дзевы Марыі... Колькі гадоў прайшло, а памятаю сустрэчу ў дробязях. Другі раз я пабываў у Мосары разам з праваахоўнікамі Віцебшчыны. Булька паказваў нам знакаміты супрацьалкагольны музей. Распавядаў пра тое, як не вянчае і не хрысціць, калі ведае, што потым будзе алкагольнае застолле. Да чаго даходзіла: нецвярозыя, убачыўшы ксяндза, літаральна збягалі ад яго, хаваліся. А ён, сталы чалавек, умудраўся... даганяць! І ў чарговы раз чытаў «лекцыі» пра неабходнасць здаровага ладу жыцця.

У музеі. Памяць пра славутага ксяндза жыве.

Справа яго жыве

Святар Марат чакаў нас пазней. А мы здзівілі раннім візітам. Дзверы ў дом ксяндза (ён жыве побач з касцёлам. — **Аўт.**) адчыніла маці пробашча. У службовым пакоі кінулася ў вочы... гітара. А праз некалькі хвілін туды зайшоў мужчына ў цывільным і на мыліцах.

— У аварыю трапіў, вось і даводзіцца пакуль што з мыліцамі хадзіць. Гітара мая. Навучыўся іграць сам, але не так добра, каб выступаць перад публікай. Рок люблю, у прыватнасці The Rolling Stones, Deep Purple... З «нашых» — «Машыну часу», «ДДТ», «Наўтылус», — распавядае ксёндз Марат, адміністратар парафіі святой Ганны ў Мосары. Такім чынам нечакана размова пачалася з музычнай тэмы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)



Сучасны Мосар.

У АСНОЎНЫМ ПА ТЭМЕ

ЭКАНОМІКА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС

Што, на думку дэпутата, трэба тлумачыць людзям?

Мая сённяшняя суразмоўца ўпэўнена: людзям проста неабходна расказваць пра тое, як працуе наша эканоміка, што аказвае на яе пазітыўны, а што — негатыўны ўплыў. Дэпутат Аршанскай гарадской выбарчай акругі №26, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Людміла Дабрыніна ў інтэрв'ю заўважыла, што важна не толькі дапамагчы людзям вырашыць праблему, але і правесці пры гэтым эканамічны лікбез.

Калі сітуацыя нестабільная

— Вельмі важна на гэтым этапе, калі наша эканоміка працуе, відаць, у самых складаных умовах у параўнанні з іншымі гадамі, быць бліжэй да людзей, — лічыць Людміла Дабрыніна. — Наша эканоміка, як вядома, цесна звязана з сусветнай. Падзенне цэн на нафту, дэвальвацыя расійскага рубля і, адпаведна, іншых валют ЕАЭС, звужэнне рынкаў збыту — усё гэта ўплывае і на развіццё беларускай эканомікі. Калі няма продажаў, малая выручка, нашы прадпрыемствы і арганізацыі працуюць нестабільна. Эканоміка краіны складваецца, натуральна, з эканомікі рэгіёнаў, эканомікі кожнага прадпрыемства, кожнай арганізацыі. Але, акрамя знешніх фактараў, што негатыўна ўплываюць на стан эканомікі, ёсць і шэраг унутраных. Эфектыўнае кіраванне, развіццё знешняга гандлю, дыверсіфікацыя рынкаў збыту — вось тое, што можа палепшыць эканамічную сітуацыю ў нас.

Дэпутат заўважыла, што кожнага з нас хвалюе замаруджванне тэмпаў росту даходаў насельніцтва.

— Сёння, калі становішча ў плане эканомікі нестабільнае, мы павінны правільна патлумачыць людзям, чаму гэта адбываецца, ад чаго залежыць эканоміка краіны, якія праблемы неабходна вырашаць у першую чаргу, чаму мы сёння павінны жыць па сродках, якія праблемы ёсць на прадпрыемствах. Я заўсёды кажу ў калектывах, што вырашэнне пэўных праблем залежыць ад саміх людзей. На маю думку, важна, каб гэта зразумелі.

> Людзей сёння найбольш турбуюць пытанні працаўладкавання, памеру пенсій, будаўніцтва жылля, бытавыя праблемы.

Найлепшы рэгіён для бізнесу

Падчас прыёмаў грамадзян, сустрэч у працоўных калектывах парламентарый асаблівую ўвагу надае эканамічнай сітуацыі ў сваім рэгіёне.

— Калі казаць пра маю акругу, то трэба адзначыць, што ўсё ж удалося забяспечыць выкананне шэрагу паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, ёсць рост індэкса фізічнага аб'ёма прамысловай прадукцыі, — адзначыла Людміла Дабрыніна. — Забяспечана станоўчая дынаміка па вытворчасці прамысловай прадукцыі і прадукцыі сельскай гаспадаркі, прыцягненні прамых замежных інвестыцый, уводзе ў эксплуатацыю жылых дамоў. Экспарт паслуг за 4 гады пяцігодкі павялічыўся ў 2,9 раза. Прамыя замежныя інвестыцыі ў 2011 годзе склалі 1,3 млн долараў, а ў 2014-м — 65 мільёнаў. Уяўляеце, у колькі разоў павялічыўся іх аб'ём? Падчас выступленняў у працоўных калектывах я асобна адзначаю развіццё малога і сярэдняга бізнесу.

Дарэчы, Аршанскі раён — пераможца сярод раёнаў з колькасцю насельніцтва больш за 50 тысяч чалавек па ўмовах вядзення бізнесу.

— Нават у гэтым годзе з'яўляюцца новыя прадпрыемствы ў малым бізнесе. Сёлета ў Аршанскім раёне зарэгістравана 256 індывідуальных прадпрымальнікаў і 30 малых і мікраарганізацый, створана 15 новых арганізацый на плошчах, якія не выкарыстоўваліся або выкарыстоўваліся неэфектыўна, і дзве новыя вытворчасці. Арганізавана 75 новых працоўных месцаў.

> Аршанскі раён — пераможца сярод раёнаў з колькасцю насельніцтва больш за 50 тысяч чалавек па ўмовах вядзення бізнесу.

Але ўклад бізнесу ў развіццё эканомікі павінен быць больш важкім. Удзельная вага яго сёння па краіне складае ў сярэднім 30%, у будучыні ж плануецца давесці гэты паказчык да 60% — гэта ж нашы працоўныя месцы! Тое, што ў рэгіёне створаны адпаведныя ўмовы — гэта добра. Асабліва важна, што сёння развіваецца менавіта бізнес у сферы вытворчасці.

Насуперак крызісу

Людміла Дабрыніна ўпэўнена: вельмі важна сёння ведаць, якія праблемы ёсць унутры рэгіёна або калектыву таго ці іншага прадпрыемства.

— Мяне як дэпутата, які прадстаўляе Аршанскую выбарчую акругу, вельмі цікавіць, як развіваецца сама Орша. Шмат зроблена ў плане развіцця сацыяльнай сферы. Ідзе будаўніцтва новых аб'ектаў. Толькі ў гэтым годзе рэканструяваны мост праз раку Дняпро на вуліцы Бабкова, вядзецца будаўніцтва дзіцячага садка ў мікрараёне і рэканструкцыя тэрапеўтычнага корпуса бальніцы імя Сямашкі. Нават у складаны для ўсёй краіны час жыццё не спыняецца.

Маю суразмоўцу радуе, як працуе жыллёва-камунальная гаспадарка рэгіёна.

— Сёння колькасць тых, хто звярнуўся са скаргай менавіта па пытаннях жыллёва-камунальнай гаспадаркі, значна паменшылася ў параўнанні з мінулымі гадамі. Значыць, гэтая арганізацыя забяспечвае вырашэнне жыццёва важных для насельніцтва задач, падтрымлівае парадак у горадзе.

Людзі хочуць «пісаць» законы

Людміла Дабрыніна расказала, што часта гараджане прыходзяць да яе з канкрэтнымі прапановамі па ўдасканальванні заканадаўства.

— Гэта неабавязкова прапановы ў рамках маёй кампетэнцыі, але трэба адзначыць, што мае калегі таксама ўважліва іх вывучаюць. Многія знайшлі рэалізацыю пры падрыхтоўцы законапраектаў аб зваротах грамадзян і «Аб зменах у Падатковы кодэкс».

Увогуле, па словах Людмілы Дыбрынінай, людзей сёння найбольш турбуюць пытанні працаўладкавання, памеру пенсій, будаўніцтва жылля, бытавыя праблемы. Што да курсу рубля, то такіх пытанняў да дэпутата не паступала — людзей, відаць, больш хвалюе стабільнасць цэн.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ЁСЦЬ ТАКІ ДОСВЕД

НЕ ВЫ — ДА НАС, А МЫ — ДА ВАС

Дрыбінскі раён — адзіны на Магілёўшчыне, дзе абыходзяцца без перасоўных паштовых аддзяленняў

Калі ў Магілёўскай вобласці праводзілася аптымізацыя паштовай сеткі, калі паўсюль зачыняліся нерэнтабельныя паштовыя аддзяленні, Дрыбінскі раён пазбег балючага рэфармавання. Яно прайшло тут мірна і спакойна, без крыўдаў і зваротаў насельніцтва ў розныя інстанцыі. Тутэйшыя спецыялісты ўлічылі ўсе нюансы і змаглі знайсці падыход да кожнага жыхара. Не абышлося і без дыпламатычнай дапамогі народных абраннікаў... Лідзія Дубікоўская на той час якраз была начальнікам Дрыбінскага вузла паштовай сувязі, а па сумяшчальніцтве — дэпутатам райсавета. Сёння яна ўзначальвае прадстаўнічую ўладу раёна. І дзеліцца з чытачамі «МС» досведам.

— Лідзія Савельеўна, як усё ж такі атрымалася пазбегнуць хваляванняў вакол «перасоўнага» віду аказання паслуг?

— У той час, калі іншыя раёны прыступілі да ўвядзення перасоўных паштовых аддзяленняў, «пошты на колах», мы ўжо не мелі неабходнасці гэтым займацца. Безумоўна ж, і ў нас ёсць так званыя неперспектыўныя населеныя пункты, дзе жыхароў становіцца менш. Проста мы інакш іх абслугоўваем. У нас існуе такі від паслугі, як мотадастаўка. Адрозненне вельмі вялікае. Перасоўныя аддзяленні прыязджаюць у вёску на паўгадзіны і ўвесь час знаходзяцца на адным месцы. Калі сам не прыйшоў, ніхто пра цябе не паклапоціцца. У нас усё інакш. Наша мотадастаўка заязджае да кожнага кліента. Прама на дом яму дастаўляюць пошту, перыёдыку, прымаюць розныя плацяжы, прапаноўваюць нейкі тавар. Распрацаваны 2 маршруты, на кожным з якіх 20 з лішкам населеных пунктаў. Плюс паштовыя аддзяленні, якія наведваюцца з мэтай абмену поштай. Мы арыентавалі нашых паштальёнаў на тое, каб яны вельмі шчыльна працавалі з людзьмі, знаходзілі з імі кантакт. Трэба пенсіянеру купіць лекі — чаму б не пайсці насустрач? Тым больш што аптэка ў Дрыбіне насупраць паштовага вузла сувязі. Або ўзяць нейкую даведку. Для старога чалавека гэта вельмі зручна. Ахвотныя могуць заказаць пэўны тавар. Па заказу прывозілі нават бытавую тэхніку.

Дарэчы, укараненнем аўтамотадастаўкі мы займаліся яшчэ з 2005 года — пачыналі аднымі з першых у вобласці. Вялікую дапамогу мне тады аказала Галіна Генадзеўна Савянок, у той час эканаміст, а цяпер начальнік раённага вузла паштовай сувязі. Разам з ёй мы абышлі практычна кожную вёску. Ёсць такія населеныя пункты, дзе жывуць адна або 2-3 сям'і, накшталт Асінаўкі, Язычкава, Лядзешні, Зямцоў, Мілаўя. Мы ніводную не абмінулі. Калі вёска маленькая, заходзілі да кожнага ў дом, у вялікіх збіралі сельскі сход. У гэтым нам вельмі дапамагалі старасты. Размаўлялі з людзьмі, шукалі ўзаемапаразумення і толькі пасля гэтага ўводзілі аўтамотадастаўку. Не секлі з пляча: маўляў, сёння адпраўляем аўтамабіль — і кропка. Нагул, за апошнія 13 гадоў у раёне было закрыта 2 паштовыя аддзяленні, прычым, без болю і без скарачэнняў.

— А наколькі эфектыўна працуюць дэпутаты раёна ў іншых кірунках?

— Я ўжо чацвёртае скліканне з'яўляюся дэпутатам раённага Савета. Праца цікавая, увесь час з насельніцтвам. Раён наш невялікі, усяго 10,4 тысячы чалавек. Спецыфіка ў тым, што ў нас пабудавана 6 пасёлкаў для перасяленцаў. Працуем перш за ўсё з жыхарамі, праводзім сельскія сходы, спрабуем вырашаць набалелае. На сходы запрашаем кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, сацыяльную службу, праваахоўнікаў, ратавальнікаў, гандаль. Арганізоўваем агітцягнік «Клопат», куды ўваходзяць прадстаўнікі райпа, медыцыны, мастацкай самадзейнасці. Размаўляем з людзьмі, выслухоўваем іх праблемы, а потым прапаноўваем культурную праграму. Людзі вельмі задаволены. Апошні сход праводзілі ў Раснянскім сельсавеце ў вёсцы Навасёлкі. Вельмі здзівіла, што да ўлады ніякіх пытанняў там не ўзнікла. Нават пацікавілася: чаму? І так прыемна было пачуць: «У нас усё добра!» Гэта пры тым, што за люты і сакавік да нас на сельскіх сходах паступіла 83 звароты. У асноўным былі пытанні па дарогах і калодзежах. На сёння мы больш за 100 калодзежаў пачысцілі і адрамантавалі. Апошні час прыбіралі прысядзібныя ўчасткі і аднымі з першых у вобласці дапамаглі людзям убраць свой ураджай. Займаемся і зносам старых дамоў. За мінулы год і з пачатку гэтага выяўлены 342 такія дамы, 109 ужо знесены. З больш як 600 га пустуючай зямлі звыш 400 га ўцягнута ў сельскагаспадарчую вытворчасць: гаспадаркі сеялі тут грэчку, проса, кукурузу, іншыя культуры.

Вельмі дапамагае вопыт працы кіраўніка паштовага вузла сувязі. Спачатку там таксама было цяжка. Калі ўзнікалі складаныя пытанні, звярталася ў больш высокія інстанцыі. Астатняе вырашалася з дапамогай трох важкіх складнікаў: дысцыпліны, прыстойнасці і сумленнасці. Прыемна, што з «аўтсайдараў» мы хутка выйшлі на перадавыя пазіцыі, а я асабіста атрымала ганаровую грамату Міністэрства сувязі.

Цяпер вось радуюся за нашых дэпутатаў. Прыемна, што па выніках мінулага года праца сельскіх Саветаў раёна атрымала станоўчую адзнаку на абласным узроўні. А Першамайскі сельскі Савет дэпутатаў, які ўзначальвае Міхаіл Іўкін, быў прызнаны найлепшым не толькі ў раёне, але і ў вобласці.

— Часта дэпутаты скардзяцца на недахоп грошай для вырашэння тых ці іншых пытанняў...

— Мы разумеем, што лішніх грошай няма. Таму прыцягваем жыхароў да ўдзелу ў навядзенні парадку. Праводзім конкурс на найлепшы падворак — і з кожным годам удзельнікаў становіцца ўсё больш. Усе прадпрыемствы і арганізацыі раёна замацаваны за населенымі пунктамі і грамадзянскімі могілкамі. Ва ўсіх аграгарадках ёсць участкі жылкамгаса. Для насельніцтва існуе вялікі пералік платных паслуг. Але калі чалавек адзінокі, дапамагаем на грамадскіх пачатках. Вось нядаўна ў адной з вёсак адзінокая бабуля паскардзілася, што дрэва каля дома дастаўляе ёй нязручнасці. Праверылі і вырашылі, што трэба зрэзаць. Жанчына засталася задаволеная.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

zigulya@zviazda.by

ПЯЦЬ ГАДОЎ БЕЗ КСЯНДЗА БУЛЬКІ

Магіла ксяндза Булькі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Як я працягваю традыцыі, закладзеныя шаноўным пробашчам? Стараюся адпавядаць. Думаю, у чэрвені 2016-га адкрыем музей імя Булькі. У спадчыну ж засталося шмат дакументаў і фотаздымкаў, — працягвае ксёндз.

Сярод экспанатаў, прысвечаных Бульку, — атэстат сталасці. Школьніку Бульку не даваліся дакладныя навукі. Відаць, самім лёсам было наканавана, каб ён стаў «гуманітарыем». А навуцы любіць і паважаць людзей, перажываць за іх у ксяндза можна павучыцца. За свае добрыя справы па адраджэнні духоўнасці ён быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. У прыходскім музеі ёсць і вельмі рэдкія экспанаты, напрыклад більярд. Другі такі толькі ў Нясвіжскім замку. Але там ён пасля рэстаўрацыі, а мосарскі без яе...

Да яго магілы і сёння едуць пакланіцца людзі здалёку.

— Жанчына са Смаленскай вобласці прыязджала, і не раз, каб зведаць шчасце мацярынства. Далёкі шлях пераадольвала, каб памаліцца. Рабіла гэта ля рэліквій Святога Юстына, аднаго з першапакутнікаў, апалагетаў хрысціянства. Прасіла міласці Бога і ля магілы ксяндза. І нарадзілася ў яе дзіця! — кажа суразмоўца.

Як і пры Бульку, многія наведвальнікі ў спецыяльнай кніжцы пішуць просьбы аб тым, каб іх родныя, блізкія кінулі піць... Лічыцца, што дапамагае пераадолець залежнасць і крынічная вада з Мосара. На жаль, ваду ў крыніцах часова браць нельга — не адпавядае дазволеным нормам якасці.

— Неабходна, каб, як і раней, тут працаваў пункт харчавання: каб хаця б чай з дарогі прыязджыя маглі папіць. А ў ідэале добра будзе, калі госці Мосара змогуць пачаставацца нацыянальнымі беларускімі стравамі — дранікамі і блінамі з печы, паспытаць на смак натуральную смятану, папіць свежага малака... А для прыхаджан адкрыць клуб, каб збіраліся разам пачытаць Святое Пісанне або паглядзець у кампаніі трансляцыю матчаў чэмпіянату свету па футболе, — дзеліцца марамі і планамі ксёндз Марат.

Старшыня касцельнага камітэта Станіслаў Ігнатавіч БУКА і ксёндз Марат.

Сярод ідэй і выстава старых фота, прысвечаных Мосару і яе людзям, якія ў розныя часы жылі тут...

“ Да чаго даходзіла: нецвярозыя, убачыўшы ксяндза, літаральна збягалі ад яго, хаваліся. А ён, сталы чалавек, умудраўся... даганяць!

«Без прыгажосці выцягнеш... душу»

Ксёндз з болем гаварыў і пра тое, што, на жаль, вясковай моладзі мала, як і дзятвы... Святар адзначыў, што і ў сельсавеце, і ў райвыканкаме вельмі ахвотна падтрымліваюць ініцыятывы, каб надалей Мосар заставаўся прывабным для турыстаў месцам. Ксёндз, дарэчы, спадзяецца на ўдзел у гэтай справе ўсіх, хто можа дапамагчы захаваць прыгажосць.

— Касцёл у Мосары пабудаваны ў 1792 годзе. Зразумела, перыядычна яму патрэбны рамонт. Сцены трэба прывесці ў парадак, дах працякае... Вашу газету многія чытаюць — няўжо ніхто не адгукнецца, не дапаможа? Разумею, што ў райвыканкаме грошай на ўсё не хапае. Былы старшыня Міхаіл Кандзерскі як мог дапамагаў Бульку, знаходжу паразуменне і ў цяперашняга старшыні Алега Морхата... Упэўнены, што ў кожным раёне ёсць ініцыятыўныя людзі, і іх вельмі важна падтрымліваць на ўзроўні ўлады. Спрыяць, калі людзі дбаюць пра захаванне памяці аб мінулым, спрабуюць даць другое жыццё старым будынкам, храмам. Зразумела, у прадстаўнікоў улады шмат іншых клопатаў. Вядома ж, без хлеба ногі выцягнеш. Але без прыгажосці — душу. Калі чалавек бачыць вакол прыгажосць, ён жа і сам захоча развівацца: працаваць лепш, ведаць больш, — разважае ён.

На развітанне ксёндз Марат папрасіў звярнуцца да чытачоў з просьбай, каб паважалі і цанілі ўсё, што тычыцца нашай гісторыі, веры, каранёў... Каб вёсак, падобных да Мосара, стала больш.

Фота аўтара.

pukshanski@zviazda.by

Глыбоцкі раён — Віцебск.

І «ПЛЮСЫ», І «МІНУСЫ»

абмяркоўваюцца на рэгіянальных дэпутацкіх сходах на Гродзеншчыне

Разам з дэпутатамі мясцовых Саветаў, кіраўнікамі органаў выканаўчай улады, прадпрыемстваў і арганізацый, актывістамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў гэтых форумах удзельнічаюць і члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

— Падводзячы вынікі пяцігодкі, мы аналізуем, што зроблена за гэты час у кожным рэгіёне ў аграрнай сферы, прамысловасці, будаўніцтве, іншых галінах эканомікі і ў сацыяльнай сферы, бяром на заметку карысны вопыт і вызначаем арыенціры на будучыню, — кажа **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**

Напрыклад, у абласным цэнтры ўдзельнікі рэгіянальнага сходу пабывалі ў новай школе №40, што адкрылася 1 верасня, азнаёміліся з мадэрнізацыяй вытворчасці, на прадпрыемстве «Гроднахлебпрам» і «Гродзенскі мясакамбінат». Сваімі меркаваннямі аб надзённых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця падзяліліся **старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ і старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Анатоль НІКІЦІН.**

Галоўны ўрач дзіцячай паліклінікі №1, дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета Ірына ЛУКАНСКАЯ адным з найважнейшых дасягненняў апошніх гадоў лічыць буйныя інвестыцыі ў медыцыну. Узведзены новыя будынкі абласной дзіцячай бальніцы, Дома дзіцяці, станцыі пераліванне крыві, урачэбнай амбулаторыі для дзяцей у мікрараёне Альшанка, рэканструявана інфекцыйная бальніца. Зараз гродзенцам даступны практычна ўсе віды высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

prakopchik@zviazda.by

...ЯШЧЭ ВЫШЭЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У цэнтры адрамантавалі гарадскі ўнівермаг і будынак пошты, крамы а таксама рэстаран райспажыўтаварыства.

«Геаграфічныя» выгоды

Нездарма ж згадвалася, што Высокае — самы заходні горад нашай краіны. Зусім недалёка пралягае мяжа з Еўрасаюзам. А еўрапейскія суседзі, як вядома, вялікую ўвагу надаюць пытанням экалогіі. Зразумела, што ў памежжы гэтыя праблемы зручна вырашаць супольна. Таму ў рамках трансгранічнага супрацоўніцтва рэалізуецца шэраг праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Па адным з такіх праектаў у Высокім пракладзены каналізацыйныя сеткі. Падрадчыкам па выкананні работ стала Бярозаўская ЖКГ, спецыялістамі якой ужо зманціравана 16 кіламетраў труб. Зроблена гэта ў старой частцы горада, цяпер жыльцы прыватнага сектара атрымалі доступ да гарадскіх выгод з карысцю для экалагічнай сітуацыі. Работы толькі што закончаны, яшчэ дзе-нідзе трэба падсыпаць, выраўняць раскапаныя падчас пракладкі сетак дарогі, выправіць іншыя хібы, якія непазбежна ўзнікаюць у такіх выпадках.

Варта сказаць і пра галоўную славутасць Высокага, аб'ект, дзякуючы якому горад значыцца ва ўсіх энцыклапедыях ды гістарычных даведніках — старадаўні парк. Гэта частка былога палаца-паркавага ансамбля Сапегаў-Патоцкіх. У парку засталіся фрагменты даўнейшых пабудоў, а таксама цэлыя алеі дрэў, якім ужо больш за сто гадоў.

Рэканструкцыя парка вядзецца з вясны мінулага года па Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча—Беларусь—Украіна». На еўрапейскі грант была зроблена кансервацыя руін уязной брамы, а таксама адноўлена цагляная агароджа з боку параднага ўезда ў парк. Пабудавана пяцімаршавая лесвіца на крутым спуску да ракі Пульва. Падсыпаны і абноўлены дарожкі, з'явіліся малыя архітэктурныя формы. Летась у парку ўзведзены летні амфітэатр. Частка грошай на рэканструкцыю выдзелена і з мясцовага бюджэту, гэта, дарэчы, з'яўляецца адной з умоў атрымання гранта.

Горад і гараджане

У Высокім пражывае каля 6000 чалавек. Зараз у горадзе зарэгістравана 126 прыватных прадпрымальнікаў розных узроўняў. Прыватны бізнес тут развіваецца стабільна, і апошняе вельмі важна, бо пасля таго, як закрыліся ранейшыя прадпрыемствы савецкага перыяду, такія як «Сельгастэхніка», завод ЖБВ, у невялікім населеным пункце адчуваецца напружанне з рабочымі месцамі. Вырашэнню праблемы ў многім паспрыялі такія прадпрыемствы, як «Белавежскія сыры», «Аграпрадукт». Брэнд «Белавежскія сыры» вядомы далёка за межамі нашай краіны. Падробкі з саматужнай этыкеткай, на якой значылася памянёнае прадпрыемства, ужо сустракалі нават у Краснадарскім краі, хоць туды сыры з Высокага ніколі не пастаўлялі. Ужо гэты факт сведчыць аб тым, што прадукцыя з невялікага гарадка папулярная ў суседняй Расіі. Дырэктар прадпрыемства Аляксандр Палавой з'яўляецца членам Высокаўскага гарадскога выканкама. І ва ўсіх гарадскіх справах і клопатах ён разбіраецца не горш, чым у гаспадарцы свайго прадпрыемства. І дапамагае па магчымасці.

Яшчэ адзін прыклад сучаснага бізнесу, які ўстойліва развіваецца, — адкрытае акцыянернае таварыства «Аграпрадукт». Вытворчая база самага буйнога ў краіне прадпрыемства па перапрацоўцы рапсавага алею знаходзіцца ў ваколіцах Высокага. Але заняты на ім многія гараджане. Калектыў у 160 чалавек забяспечвае вытворчасць 180 тысяч тон масла ў год. Сярэдняя зарплата тут складае крыху больш за 6,5 мільёна рублёў. Для сельскай мясцовасці гэта не проста добры, а выдатны паказчык.

Толькі набірае абароты прадпрыемства «БелМінералГруп», але гэта зусім унікальная вытворчасць. Прадпрымальнік Аляксандр Кужэльны набыў былыя памяшканні райсельгастэхнікі і разгарнуў вытворчасць уцяпляльніка, які не гарыць. Валокны, знешне вельмі падобныя на шэрую вату, аказваецца, вытрымліваюць тэмпературу да 900 градусаў, бо атрымліваюць іх з базальту. Пакуль прадукцыя запатрабавана брэсцкай фірмай «Гефест», але высокаўскія прадпрымальнікі перакананы, што яны знойдуць свайго спажыўца і ў другіх рэгіёнах краіны, а таксама ў замежжы.

Ёсць у Высокім і зусім невялікія прадпрыемствы, такія як, напрыклад, прыватная кузня Васіля Марынчука. Тут заняты ўсяго некалькі чалавек. Па-першае, Васіль Марынчук набыў сцены старой сінагогі, якая ўжо развальвалася, і даў ёй новае жыццё. Па-другое, стварыў некалькі рабочых месцаў. Людзі ў яго заняты запатрабаванай справай. Металічныя вырабы, хоць і не танныя, але апошнім часам сталі папулярнымі ў афармленні сядзіб. Таму заказы ёсць. Адну з лавак у гарадскім скверы, зробленую ў кузні, Марынчук падарыў гораду. Яго прыклад падтрымалі іншыя дзелавыя людзі гарадка. І ў абноўленым скверы з'явіліся лаўкі, упрыгожаныя металічным арнаментам з шыльдамі, якія сведчаць, што іх падарылі сем'і Калешка, Лісічык, Карунец.

Гэтымі падарункамі высокаўскі мэр вельмі ганарыцца.

Прыходзьце на прыём

Мікалай Анатольевіч расказваў, што падчас добраўпарадкавання сквера многія і многія гараджане неслі кветкі, каб пасадзіць іх на гарадской клумбе. Гэта будоўля нават нейкім чынам з'яднала горад. І цяпер прыкметна, што людзі клапоцяцца, каб усё ў скверы захавалася, каб ніхто не псаваў прыгажосць. Ідзём па скверы з Мікалаем Сачыкам, сустракаем маладую маму з каляскай: адна дачушка маленькая, другая трымаецца за руку. Цікаўлюся, наколькі зручна гуляць і адпачываць тут. Аксана Іванова гаворыць, што стала і прыгожа, і зручна. Яшчэ маладая маці сказала, што ў сям'і чакаецца папаўненне, а сям'я здымае прыватны дом, не вельмі цёплы і ўтульны. Старшыня гарадскога Савета і па сумяшчальніцтве выканкама запрасіў яе прыйсці ў выканкам, каб разгледзець варыянты паляпшэння жыллёвых умоў, якія ён можа прапанаваць.

Варта сказаць, што ў горадзе будуюцца і кватэры, і цэлы мікрараён прыватных дамоў, у які ўжо падведзены асноўныя камунікацыі. Значыць, будуць яшчэ нараджацца дзеці.

Фота аўтара.

yackevich@zviazda.by

Камянецкі раён.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ТОРГАХ

Ушачский районный исполнительный комитет Витебской области объявляет открытые торги в форме аукциона о предоставлении права на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака на территории озер Туросы, Мугирино Ушачского района

Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей	Размер увеличения цены объекта аукциона, рублей
Лот № 1: Право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака на территории озера Туросы Ушачского района	В соответствии с заключением, предоставленным Национальной академией наук Беларуси по биоресурсам, допустимый годовой объём изъятия длиннопалого рака на озере Туросы составляет 50 килограммов	3 600 000	1 800 000	360 000
Лот № 2: Право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака на территории озера Мугирино Ушачского района	В соответствии с заключением, предоставленным Национальной академией наук Беларуси по биоресурсам, допустимый годовой объём изъятия длиннопалого рака на озере Мугирино составляет 100 килограммов	3 600 000	1 800 000	360 000

Аукцион состоится 23 октября 2015 г. в 14.00 по адресу: г.п. Ушачи, ул. Ленинская, 12, кабинет № 63.

Организатор аукциона:

- комиссия, созданная распоряжением председателя Ушачского райисполкома от 1 июля 2015 г. № 163р.

Для участия в аукционе в срок **до 19 октября 2015 г. до 17.00** необходимо представить комиссии (по адресу: г.п. Ушачи, ул. Ленинская, 12, кабинет 67 в рабочие дни с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00) следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (в заявлении указывается: почтовый адрес, контактный телефон заявителя, на территории какого водоема, какого вида животных планируется заготовка и (или) закупка;

- *копия платежного поручения, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области № 3600328001931, код платежа 04005 в филиале № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Полоцк, код 648, УНП 300594330;*

- копия карты-схемы рыболовных угодий с нанесенными границами в масштабе 1:50000;

- копия документа о государственной регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования и подлинник документа для проверки соответствия ему копии.

В случае признания аукциона несостоявшимся из-за того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака представляется этому участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Участникам, не выигравшим торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги в течение 5 рабочих дней.

В торгах могут принимать участие юридические лица, индивидуальные предприниматели или их доверенные лица при условии представления надлежаще оформленной доверенности.

При подаче документов заявитель (или представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и документ, подтверждающий его полномочия (доверенность представителя).

Контактный телефон: (8-02158) 2-77-05.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2

✓ Оценка оборудования и транспортных средств
✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский радиозавод», 8(0232)21 60 07

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	- Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166989, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/41, площадь – 296,0 кв.м, назначение – Здание неустановленного назначения, наименование – Здание неустановленного назначения, по начальной цене – 532 680 000 рублей с НДС. - Забор (железобетонные плиты на бетонных столбах) длиной 112 м, по начальной цене – 58 440 000 рублей с НДС. - Мощение асфальтобетонное на щебеночном основании, по начальной цене – 5 088 000 рублей с НДС. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005005687 площадью 27,9350 га.	596 208 000	59 620 800

Срок подачи заявления	**По 15 октября 2015 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 17⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**
Дата, время, место проведения аукциона	**16 октября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Условие пользования	Объекты продаются в собственность
Условия продажи	Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.022. Нумар падпісаны ў 19.30 15 верасня 2015 года.

Сяргей Грыцавец.
МАЙСТАР САКАЛІНАГА ЎДАРУ

...Чэрвеньская раніца. Вялікі, чырвоны шар сонца паволі выпаўзае з-за сопак. Вузкая, звілістая стужка ракі ў высокіх берагах ярка блішчыць, блікуе ў яго промнях. Цішыня, якая панавала да гэтага моманту, раптам узарвалася. Шматгалосае стракатанне запоўніла сабой усё неба. Дзявятка шэра-зялёных самалётаў з чырвонымі зоркамі на крылах імкліва пранесліся над поймай Халхін-Гола на ўсход, насустрач сонцу.

Нарадзіўся Сяргей Іванавіч Грыцавец 19 ліпеня 1909 года ў вёсцы Бараўцы (цяпер Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і селяніна. У гады Першай сусветнай вайны сям'я падалася ў бежанства — пераехала ў Паўднёвае Заўралле. У 1927 годзе будучы лётчык скончыў Шумілінскую чыгуначную 7-гадовую школу, працаваў некаторы час чорнарабочым у службе пуцей на чыгунцы, у «Льногандлі», вучнем слесара ў цэху механічнага завода ў Залатавусце. Скончыў ФЗВ. З 1931 года ў радах Чырвонай Арміі, па камсамольскай пуцёўцы паступіў у Арэнбургскую ваенную школу пілотаў, пасля заканчэння якой служыў у часцях знішчальнай авіяцыі лётчыкам, камандзірам звяна, атрада і палка, лётчыкам-інструктарам у ваенным вучылішчы. У 1936 годзе скончыў Адэскую школу паветранага бою.

З 10 чэрвеня па 26 кастрычніка 1938 года ў якасці добраахвотніка прымаў удзел у нацыянальна-рэвалюцыйнай вайне іспанскага народа супраць прафашысцкага рэжыму Франка. Быў камандзірам 2-й эскадрыллі, а потым групы знішчальнікаў І-16. Выканаў 88 баявых вылетаў, у 42 паветраных баях збіў 30 самалётаў праціўніка.

За ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў урада і праяўлены пры гэтым гераізм 22 лютага 1939 года ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

З 29 мая па 7 верасня 1939-га ўдзельнічаў у баях з японскімі мілітарыстамі на рацэ Халхін-Гол. Быў камандзірам асобнай эскадрыллі знішчальнікаў 70-га авіяцыйна-знішчальнага палка. Здзейсніў 138 баявых вылетаў. За збітыя там 12 японскіх самалётаў, выратаванне свайго камандзіра ў крытычнай сітуацыі і праяўлены пры гэтым выключны гераізм 29 жніўня 1939 года быў удастоены другой Залатой Зоркі Героя Савецкага Саюза. Стаў першым у краіне, каму гэтае званне было прысвоена двойчы.

16 верасня 1939 года маёр С.І. Грыцавец загінуў пры выкананні службовых абавязкаў. Пахаваны ў вёсцы Балбасава Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Яго імя прысвоена Харкаўскаму вышэйшаму ваеннаму авіяцыйнаму вучылішчу лётчыкаў, вуліцам у Маскве, Мінску, Кургане, Оршы і Баранавічах. Бронзавы бюст усталяваны ў горадзе Баранавічы, абеліск — на месцы гібелі ў вёсцы Балбасава, помнік і мемарыяльная дошка — у Мінску. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (двойчы), Чырвонага Сцяга (двойчы), а таксама мангольскім ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга.

Яны разумелі, што час выпрабаванняў набліжаецца імкліва.

Да канца ліпеня 1936 года ў Адэскую школу паветранага бою з'ехалася большасць лётчыкаў-знішчальнікаў першага набору.

Сяргей пісаў у Маскву брату Івану:

«З 1 жніўня я знаходжуся ў Адэсе і вучуся ў школе. Між іншым, вельмі добра даюць тэорыю. Лятаю на новым знішчальніку. Працаваць даводзіцца вельмі шмат: з сямі гадзін працоўны дзень і ў пазашкольны час займаемся да 1-2 гадзін ночы. Наша вучоба, аказваецца, разлічана на год, а кажуць яшчэ так, што пры ўзмоцненых тэмпах вучобы скончым школу за 6-8 месяцаў. Гэта было б вельмі добра. Калі так будзе, то Галя на гэты час застанецца жыць у маці, праўда, сумнавата будзе паасобку жыць, але нам з ёй не прывыкаць. Вось так справа ідзе ў нас. Пакуль усяго добрага. Твой брат Сярожа».

Пасля заканчэння школы Грыцавец служыў у розных авіяцыйных часцях. У званні старшага лейтэнанта выконваў абавязкі камандзіра звяна 8-й Адэскай школы пілотаў Кіеўскай ваеннай акругі, рыхтаваў да паветраных баёў у тым ліку і іспанскіх лётчыкаў-рэспубліканцаў, а сам пісаў рапарты з просьбай накіраваць яго ў Іспанію, якая змагалася з фашызмам. Нарэшце, у чэрвені 1938 года ён з замежным пашпартам на імя Горава Сяргея Іванавіча ў складзе групы з 34 лётчыкаў-добраахвотнікаў уступае ў шэрагі рэспубліканцаў.

ДАВЕДКА. У чэрвені 1936 года ў Іспаніі ўспыхнуў ваенны мяцеж супраць рэспубліканскага ўрада, яго ўзначаліў генерал Франка. Пачалася грамадзянская вайна. Дапамогу франкістам аказалі Германія, Італія, Партугалія, некаторыя іншыя дзяржавы. На дапамогу рэспубліканцам прыйшлі добраахвотнікі з 50 краін свету, у тым ліку больш за 160 лётчыкаў з Савецкага Саюза. У Іспаніі ўпершыню сутыкнуліся погляды на тактыку прымянення ВПС двух галоўных праціўнікаў у Другой сусветнай вайне — СССР і Германіі. Камандаванне люфтвафе разглядала грамадзянскую вайну ў Іспаніі як добрую магчымасць выпрабаваць авіятэхніку. Гэтая задача была ўскладзена на лётчыкаў так званага Легіёна Кондар і Вернера Мёльдэрса — галоўнага распрацоўшчыка «новай тактыкі» нямецкай знішчальнай авіяцыі. Такую ж задачу ставіла перад сабой і камандаванне савецкіх ВПС. Удзельнічаючы ў баявых дзеяннях, як казаў камкар Якаў Смушкевіч, «мы змаглі праверыць нашых людзей, праверыць матэрыяльную частку і, галоўным чынам, паглядзець, што з сябе ўяўляе вораг, праціўнік, з якім нам давядзецца біцца».

За 116 дзён знаходжання на іспанскай зямлі камандзіру эскадрыллі знішчальнікаў С.І. Грыцаўцу давялося ўдзельнічаць у 57 паветраных баях. Там яго называлі псеўданімамі «Серхіа» і «Камандор Серж».

У баях з варожай авіяцыяй у няроўных умовах, калі часцяком суадносіны паміж рэспубліканскімі і франкісцкімі самалётамі былі 1:5, ён прыйшоў да пераканання, што адзіна правільнай тактыкай барацьбы можа быць толькі групавы «сакаліны ўдар» — раптоўная атака ворага ўсёй эскадрылляй зверху, ззаду, збоку.

14 жніўня 1938-га група самалётаў, якой ён камандаваў, упершыню ў паветраным баі выкарыстала гэты новы тактычны прыём. Удар быў настолькі нечаканым і ашаламляльным для ворага, што непрыяцельская група страціла кіраванне. На зямлю ўпала некалькі варожых машын, ахопленых полымем. Група Грыцаўца ў поўным складзе вярнулася на аэрадром.

Усяго ў небе Іспаніі Сяргей Грыцавец здзейсніў 88 баявых вылетаў з агульным налётам 115 гадзін, у 42 (па іншых даных у 24) паветраных баях збіў 30 самалётаў саперніка (6 асабіста і 24 у складзе групы). Лётчыкі групы пад яго кіраўніцтвам збілі 85 самалётаў. Вестка аб адным з яго баявых вылетаў абляцела ўвесь свет... Паветраны бой з нямецкімі і італьянскімі асамі завязаўся ў даліне ракі Эбро над пазіцыямі корпуса Лістэра, на назіральны пункт якога ў той дзень былі запрошаны іспанскія і замежныя журналісты.

Лінію фронту перасеклі 60 бамбардзіроўшчыкаў франкістаў. Яны ўпэўнена ішлі на Мадрыд. Але іх стройныя рады парушыліся адразу ж пасля таго, як іх атакавала група знішчальнікаў Грыцаўца. Сам ён з першай атакі заваліў флагманскі самалёт. З блізкай адлегласці ўдарыў прыцэльнай чаргой спачатку па правым маторы «юнкерса», потым па кабіне лётчыка. Бамбардзіроўшчык клюнуў носам, заваліўся на бок і падставіў пад удар крыло. А пасля яшчэ чатыры пылаючыя варожыя самалёты паляцелі да зямлі. І хоць савецкіх І-15 і І-16 было два звяны, пілоты «юнкерсаў», развярнуўшыся, пачалі ліхаманкава кідаць бомбы, прычым і на пазіцыі франкістаў, абы хутчэй паляцець. А «кірпатыя» і «мошкі» — «чатас» і «москас», як з сімпатыяй называлі іспанцы знішчальнікі І-15 і І-16, — працягвалі насядаць, збіўшы ў наступных нападах яшчэ пяць «юнкерсаў». На наступны дзень бамбардзіроўшчыкі франкістаў яшчэ раз паспрабавалі прарвацца да горада, але, страціўшы чатыры самалёты, зноў былі вымушаны рэцірвацца. І ў гэты раз шлях ім перарэзала група Сяргея Грыцаўца. Лётчыка, які атрымаў баявое хрышчэнне ў небе Іспаніі ў самы напружаны перыяд баявых дзеянняў, у 1938-м, калі ў коле аблогі быў ужо і Мадрыд, і які ў лічаныя дні стаў вядомым асам.

Аб гэтай няроўнай сутычцы цэнтральная газета іспанскіх камуністаў «Мунда Абрэра» паведамляла: «Сяргей, адважны пілот Рэспублікі, верны воінскаму абавязку, гераічна змагаючыся, за адзін баявы вылет збіў 7 (сем!) фашысцкіх самалётаў (з іх 5 «фіятаў» CR-32), але і яго машына была сур'ёзна пашкоджана».

Пра гэта пісалі і многія замежныя газеты. Сярод іх — англійская «Дэйлі Ньюс», карэспандэнт якой назіраў паветраны бой і нават здолеў даведацца сапраўднае імя «камарада Сяргей». Газета выйшла з кідкім загалоўкам: «Рускі лётчык Сяргей Грыцавец — чалавек дзівоснай адвагі».

Асаблівa вызначыўся Сяргей Грыцавец у заключных і самых цяжкіх баях за Эбро, дзе немцы выкарыстоўвалі доследныя «месеры», узброеныя гарматамі, якія значна пераўзыходзілі І-16 у хуткасці. Толькі за 20 дзён жніўня 1938-га савецкімі і іспанскімі лётчыкамі былі збіты 72 варожыя самалёты.

У адным з баёў 13 жніўня 1938 года ў пары з іспанскім лётчыкам сяржантам Луісам Маргалефам Грыцавец падбіў і прымусіў прызямліцца на рэспубліканскай тэрыторыі новы нямецкі бамбавік Не-111, чый экіпаж быў узяты ў палон.

18 жніўня 1938 года — у Дзень авіяцыі — ён збіў 2 італьянскія «фіяты». Са сваімі лётчыкамі Грыцавец часам залятаў без кіслародных прыбораў на вышыню да 7 кіламетраў, каб адтуль абрынуць удар на праціўніка.

Апошні раз пілоты групы Сяргея Грыцаўца ўдзельнічалі ў баі 15 кастрычніка 1938-га, калі было паднята ў паветра адразу каля 100 рэспубліканскіх самалётаў у складзе 7 эскадрылляў. Тады над ракой Эбро ў напружанай паветранай сутычцы сумесныя намаганні савецкіх і іспанскіх лётчыкаў былі збіты 8 самалётаў праціўніка. Нашы страты склалі 3 самалёты (усе лётчыкі выратаваліся на парашутах).

Аднак да часу заканчэння 113-дзённай бітвы за Эбро, з 34 савецкіх лётчыкаў, якія прыбылі разам з Грыцаўцом у чэрвені 1938-га, засталося ў страі толькі сямёра.

22 лютага 1939 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў Указ, у якім гаварылася аб тым, што за ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў урада па ўмацаванні абароннай моцы Савецкага Саюза і праяўленыя пры гэтым асабістую мужнасць і адвагу старшаму лейтэнанту С.І. Грыцаўцу прысвойваецца званне Героя Савецкага Саюза. Сам Міхаіл Іванавіч Калінін уручыў Грыцаўцу Грамату аб прысваенні гэтага высокага звання. Варта адзначыць і той факт, што капітанам Сяргей Грыцавец ніколі не быў: са старшага лейтэнанта ён стаў адразу маёрам (адбылося гэта акурат 31 снежня 1938 года).

Адмовіўшыся ад прапанаванай пасады начальніка Барысаглебскай ваеннай авіяцыйнай школы пілотаў, ён накіроўваецца ў страявую часць на Далёкі Усход.

У поўную сілу моцныя бакі характару і лётнага майстэрства Сяргея Грыцаўца выявіліся і ў небе Халхін-Гола летам 1939 года: вокамгненная знаходлівасць, востpая назіральнасць, пачуццё таварыскай выручкі, віртуознае валоданне тэхнікай пілатавання.

ДАВЕДКА. 28 мая 1939 года Японія пасля захопу часткі Кітая і ўтварэння на гэтай тэрыторыі марыянеткавай дзяржавы Маньчжоў-Го падвяла свае войскі да межаў Мангольскай Народнай Рэспублікі і пачала ваенныя дзеянні ў раёне ракі Халхін-Гол. Савецкі Саюз, выконваючы Пратакол аб узаемнай дапамозе паміж СССР у МНР 1936 г., па просьбе мангольскага ўрада увёў свае войскі ў рэспубліку і пачаў ваенныя дзеянні. Японская авіяцыя да таго часу сваімі налётамі разграміла вядомыя ёй аэрадромы на тэрыторыі МНР, дзе было спалена шмат савецкіх самалётаў. На чале японскай авіяцыі тады стаяў адзін з вядомых асаў Марымота. З японскага боку ў паветраных баях прымалі ўдзел знішчальнікі Накадзіма AN-1 і «боінг-281» (ліцэнзійны варыянт амерыканскага самалёта). Потым у бой былі ўведзеныя найноўшыя знішчальнікі Міцубісі S-00 «зэк» (І-97). У гарызантальным манеўры і хуткапад'ёмнасці І-97 пераўзыходзілі савецкія знішчальнікі І-16. Таму ў пачатку чэрвеня СССР накіраваў у МНР падраздзяленні знішчальнікаў І-16 апошніх тыпаў і новыя манеўраныя знішчальнікі І-153 «чайка». Былі накіраваны і лётчыкі, якія мелі за плячыма вопыт баёў у Іспаніі і Кітаі.

У паветраных баях Сяргей Грыцавец асабіста і ў складзе групы збіў 12 японскіх самалётаў. Разам з ім з далёкага Пірэнейскага паўвострава сюды прыбылі Іван Лакееў, Яўген Сцяпанаў, Барыс Смірноў, іншыя савецкія паветраныя асы, з Кітая — лётчыкі Рыгор Краўчанка, Леанід Арлоў і іх калегі, якія мелі ў актыве перамогі над японскімі пілотамі, з Масквы — лётчык-выпрабавальнік Віктар Рахаў. І нават сярод гэтай кагорты, якую ўзначальваў «генерал Дуглас» (камкар Якаў Смушкевіч), Сяргей Грыцавец быў зоркай.

26 чэрвеня 1939 года ў раёне возера Буір-Нур завязаўся паветраны бой з японцамі, які доўжыўся каля дзвюх гадзін і скончыўся поўнай перамогай савецкіх лётчыкаў. Вораг страціў 15 самалётаў. У гэты дзень Сяргей Грыцавец здзейсніў подзвіг, які стаў вядомым на ўсю краіну.

Маршал Харлагійн Чойбалсан уручае Сяргею Грыцаўцу мангольскі ордэн Баявога Чырвонага Сцяга.

У баі быў збіты самалёт камандзіра 70-га знішчальнага авіяпалка маёра В.М. Забалуева, і ён спусціўся на парашуце на тэрыторыю, занятую праціўнікам. Усё гэта бачыў Сяргей Грыцавец. Нядоўга думаючы, адважны пілот пасадзіў сваю машыну непадалёк ад таварыша, дапамог яму забрацца ў кабіну і ўзляцеў пад агнём японскай пяхоты. Гэта быў першы падобны выпадак у сусветнай авіяцыі.

«Быў у нас паветраны бой з японцамі. Не стану вам апісваць яго. Ворагу мы ўсыпалі выдатна і гналі яго далёка. Раптам заўважаю я, што Забалуева няма. А біліся мы побач. Раблю круг, шукаю яго спачатку ўверсе, потым унізе. Бачу: Забалуеў сядзіць на зямлі. А зямля — чужая, маньчжурская. Ад мяжы кіламетраў 60. На гарызонце ўжо горад відаць — Ганьчжур. Дахі дамоў, слупы тэлеграфныя, грузавыя машыны... І ўжо я нічога не адчуваю, ні пра што не думаю. Адна думка ў мяне: забраць камандзіра і паляцець. Пачынаю спускацца. Увесь час, не адрываючыся, гляджу на Забалуева. І бачу: ён выскачыў з самалёта і бяжыць. Бяжыць і на хаду ўсё з сябе скідае — парашут, рэмень, ну, словам, усё цяжкае. Бяжыць з пісталетам у руцэ. Я так думаю: застрэліўся б ён. Не такі чалавек Забалуеў, каб дацца жывым у рукі ворага.

Расказваю я гэта вам доўга, а падумаць — тысячная доля секунды. У гэты час бачу, што ён махае мне рукой: маўляў, узлятай, не важдайся са мной! Ён, вядома, не ведаў, што гэта я. Ён думаў, што нехта з нашых лётчыкаў праглядае мясцовасць і трошкі заблудзіўся. І вось цікава: здавалася б, не да гэтага, а раптам я ўспомніў, як ён напярэдадні пра свайго сынка маленькага расказваў. І я тады падумаў: «Можа, загінем абодва, але выручыць цябе паспрабую!»

Заходжу на пасадку і, ведаеце, так спакойна саджуся — ну нібы на свой аэрадром. Разлічваю пры гэтым так, каб сесці як мага бліжэй да Забалуева. Бо тут кожная секунда дарагая. Вы не забыліся — мы на варожай тэрыторыі.

Прызямляюся. Самалёт ужо бяжыць па зямлі. Скача. Месца куп'істае. Вядома, была небяспека паломкі. Ну што ж, засталіся б удваіх, усё ж лягчэй. А ён ужо бяжыць мне напярэймы. Машына спынілася. Момант рашучы. Трэба было дзейнічаць неадкладна, секунда вырашала ўсё. Бяру пісталет і вылажу на правы борт. Сам азіраюся: ці не відаць японцаў? Усё баюся: збягуцца, праклятыя, на шум матора.

Забалуеў ужо каля самалёта. Лезе ў кабіну. Гаварыць няма часу. Ліхаманкава думаю: «Куды б цябе, дарагі, змясціць?» Самалёт жа аднамесны.

Неяк уціснуў яго паміж левым бортам і браняспінкай. Раптам матор пачаў чхаць. Забалуеў у гэтай цеснаце захапіў газ і прыціснуў яго на сябе. Вось-вось і вінт спыніцца. А павярнуцца ні адзін з нас не можа. Во момант! Бо калі матор заглухне, завесці яго тут будзе немагчыма!

Але тут я нейкім цудам націскаю ўсё ж на газ, і самалёт у мяне як ірвануўся і пабег, пабег!

Новая бяда. Не адрываемся. Ужо здаецца палову адлегласці да Ганьчжура прабеглі, а не адрываемся. Разумееце! Думаю: «Толькі б купіна пад кола не трапілася...» Нарэшце адарваліся! Цяпер новае мяне мучыць: хапіла б гаручага. Груз у машыне — двайны. Вышыні я не набіраю, іду нізенька зусім, каб не заўважылі. Такім манерам слізгалі мы над зялёнай маньчжурскай травой. Як дайшлі да рэчкі, лягчэй стала. Тут і фронт паказаўся. Узяў машыну «на набор». Узняліся. Ну, ліха на яго, як быццам выкараскаліся.

Знайшоў я свой аэрадром, сеў, выскачыў.

— Ну, — крычу ўсім, — выцягвайце багаж дарагі!

Ніхто не зразумеў, думалі, што японца прывёз. Вось і ўся гісторыя!»

У небе Халхін-Гола С.І. Грыцавец здзейсніў 138 баявых вылетаў. У паветраных баях збіў 12 самалётаў праціўніка (па адных звестках — 10 асабіста і 2 у групе, па іншых — усе 12 асабіста).

9 жніўня 1939-га за перамогі ў паветраных баях і выратаванне камандзіра Сяргей Іванавіч Грыцавец быў узнагароджаны другім медалём «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза. Ён быў не толькі слаўным паветраным байцом, але і выдатным настаўнікам. Дзясяткі маладых лётчыкаў вучыліся ў Грыцаўца майстэрству паветранага бою. Ён праводзіў з імі разборы палётаў, заняткі па тактыцы, вучыў спалучаць манеўр і агонь. «Толькі секунда адводзіцца лётчыку на прыцэльную чаргу, — казаў ён. — Толькі адна секунда!»

Ён і на самай справе ўмеў першым даць чаргу, на якую долю секунды апярэджваючы ворага. Атакаваў заўсёды нечакана, ніколі не дапускаючы шаблону ў тактыцы. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны менавіта Грыцавец быў самым выніковым савецкім лётчыкам-знішчальнікам, маючы 42 паветраныя перамогі!

У пачатку верасня 1939 года маёр С.І. Грыцавец разам з групай лётчыкаў, якую узначальваў камкар Я.В. Смушкевіч, выехаў у Маскву. Ён быў прызначаны саветнікам адной з авіябрыгад Беларускай асобай ваеннай акругі. Меўся быць паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь.

16 верасня Грыцавец з групай лётчыкаў прысутнічаў на пасяджэнні Ваеннага савета акругі ў Мінску. Вярталіся на свой аэрадром пад Оршай у прыцемках. Грыцавец прызямліўся першым. Маёр П.І. Хара, які ішоў на пасадку другім, не разглядзеўшы выкладзеную літару «Т», пачаў садзіцца з процілеглага боку аэрадрома і на вялікай хуткасці ўрэзаўся ў машыну Грыцаўца, якая ўжо стаяла. У выніку сутыкнення абодва самалёты былі разбіты, Хара атрымаў сур'ёзныя траўмы, Грыцавец загінуў. Так недарэчная выпадковасць стала прычынай гібелі выдатнага савецкага лётчыка. Жыццё падарыла яму толькі трыццаць гадоў.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
slaneuski@zviazda.by

С.І. Грыцавец і выратаваны ім камандзір 70-га знішчальнага авіяпалка маёр В.М. Забалуеў.

ялётка, лятаючых машын, запісваліся ў авіяклубы, вучыліся лятаць на планёрах, як толькі падрасталі. А стаўшы «чырвонымі авіятарамі», з усіх сіл даказвалі, што ім давяраюць, што на іх спадзяюцца неда-

У разгар бою лётчык заўважыў, як да хваста машыны яго таварыша Леаніда Арлова прыстроіўся японскі знішчальнік. Наш лётчык, захоплены атакай, не бачыў гэтага, і тады Сяргей пайшоў у лоб на японца. Той не вытрымаў сустрэчнай атакі і ўзняўся ўверх. Грыцавец даў кароткую прыцэльную чаргу. Варожы пілот кінуў сваю машыну на гэты раз у крутое піке, прыкінуўся, што падбіты і падае. Хітрыкі не прайшлі, яны былі добра знаёмы Грыцаўцу яшчэ па баях у Іспаніі. Яго машына імкліва нырнула ўніз за самураем, дагнала яго і з блізкай адлегласці расстраляла. Японскі знішчальнік, не выходзячы з піке, урэзаўся ў пясчаны бархан.

У баях у раёне ракі Халхін-Гол Сяргей Грыцавец збіў 12 японскіх самалётаў і давёў колькасць сваіх паветраных перамог да 42...

Але ўсё гэта было значна пазней. А 1 жніўня 1936 года малады ваенны лётчык у новенькай форме са скрыпучымі рамянямі і невялікім фанерным чамаданчыкам у руцэ, стоячы на прыпынку, чакаў, калі падыдзе трамвай №13, або, як яго тут называлі, «авіяцыйны», каб ехаць з вакзала «Адэса-Галоўная» ў бок Люстдорфа — прыморскай дзіцячай кліматычнай станцыі. Надыходзіў яшчэ адзін спякотны дзень, але раніцай пакуль не прыпякала, і лётчык адчуваў сябе бадзёра і лёгка, з асалодай удыхаў свежае і вільготнае марское паветра. Настрой быў выдатны.

Вагон, амаль парожні ў такі ранні час, прыняў самотнага пасажыра, з грукатам пабег па пустых вуліцах, засаджаных каштанамі ўперамешку з субтрапічнымі пальмамі. Перад Люстдорфам трамвай павярнуў на Ульянаўку і спыніўся недалёка ад кантрольна-прапускнога пункта авіяцыйнай школы. Сяргей Грыцавец, а гэта быў ён, выйшаў з вагона. Чуліся родныя гукі аэрадрома...

Ядром адэскай школы найвышэйшага пілатажу была авіяцыйная эскадрылля спецыяльнага прызначэння. Таленавітыя кадравыя лётчыкі ВПС Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам вопытных інструктараў-метадыстаў адточвалі тут майстэрства вядзення паветранага бою, павышалі меткасць паветранай стральбы, словам, авалодвалі поўным курсам прымянення ў баі найноўшага самалёта — знішчальніка І-16. Грыцавец з кожным днём лятаў усё больш упэўнена, адпрацоўваў прыдзірліва і старанна кожны манеўр. І чым больш лятаў, тым больш строга ставіўся да сябе, таму што ведаў: толькі так можна стаць уладаром неба, а быць у небе выпадковым чалавекам ён не хацеў... Наогул, трыццатыя гады беспамылкова можна назваць «крылатымі». Акрамя таго, што з'явіліся першыя Героі, савецкія лётчыкі здзейснілі працяглыя замежныя палёты: іх сустракаў увесь свет. Краіна любіла сваю авіяцыю, ганарылася ёю. Хлапчукі, ледзьве навучыўшыся трымаць аловак, малявалі самалёты, ведалі, чым адрозніваюцца легендарныя «АНТы» ад гіганцкіх «Максімаў Горкіх», бегалі з урокаў на кінафільмы «пра лётчыкаў», будавалі ў дамах піянераў мадэлі лятаючых машын, запісваліся ў авіяклубы, вучыліся лятаць на планёрах, як толькі падрасталі. А стаўшы «чырвонымі авіятарамі», з усіх сіл даказвалі, што ім давяраюць, што на іх спадзяюцца неда-

Першы Герой Савецкага Саюза А.В. Ляпідзеўскі.

Першы двойчы Герой Савецкага Саюза С.І. Грыцавец.

Першы тройчы Герой Савецкага Саюза А.І. Пакрышкін.

ДАВЕДКА. Савецкія паветраныя асы трыццатых гадоў: 1. Сяргей Грыцавец — 42 самалёты (вайна ў Іспаніі, баі на Халхін-Голе) 2. Пётр Казачэнка — 15 (япона-кітайская і савецка-фінляндская войны) 3. Іван Лакееў — 12 (вайна ў Іспаніі) 4. Віктар Рахаў — 8+6 у групе (баі на Халхін-Голе) 5. Сцяпан Данілаў — 8 (баі на Халхін-Голе) 6. Анатоль Сяроў — 8 (вайна ў Іспаніі) 7. Аляксей Благавешчанскі — 7+2 у групе (япона-кітайская вайна) 8. Арсень Варажэйкін — 6 (баі на Халхін-Голе) 9. Павел Караткоў — 6 (вайна ў Іспаніі) 10. Павел Рычагоў — 6 (вайна ў Іспаніі).

У ліку савецкіх асаў трыццатых гадоў — лётчыкі Антон Губенка, Рыгор Краўчанка, Георгій Захараў, Аляксандр Асіпенка, Сцяпан Супрун, Іван Яроменка, Віктар Бадроў, Сяргей Дзянісаў, Яўген Сцяпанаў... Кожны з іх знішчыў, па інфармацыі некаторых даследчыкаў, больш за 5 самалётаў праціўніка. Аднак дакладных даных аб усіх іх паветраных перамогах няма.

ШКОЛА З «ПАЖАРНЫМ» НУМАРАМ

Гідраўлічныя нажніцы рэжуць метал, як масла.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па-другое, мы праводзім вучэнні ў корпусе, дзе займаюцца дзеці да чацвёртага класа. І калі мы не навучым іх бяспецы ў гэтым узросце, працаваць з імі, калі яны стануць падлеткамі і юнакамі, будзе ўжо позна. Працуем мы і з дарослымі — рэгулярна выступаем на бацькоўскіх сходах, дэманструем тэматычныя фільмы... Разам з тым няспынна нагадваем, што менавіта яны і нясуць адказнасць за дзяцей, мусяць усё ім тлумачыць і расказваць. Асабліва цяпер, на пачатку навучальнага года, калі дзеці прайшлі праз рэзкую перамену абстаноўкі.

Вучэннем у пачатковай школе папярэднічаў «Урок бяспекі». Ён праходзіў інтэрактыўна: спецыялісты не выкладалі матэрыялу ў выглядзе лекцыі, а проста гутарылі са школьнікамі. Дзеці пасля прызнаваліся, што так матэрыял засвойваецца куды лепш...

ГІДРАЎЛІКА СУПРАЦЬ МЕТАЛУ

Далёка не ўсе дарослыя бачылі ў рэальнасці, як працуе спецыяльны інструмент ратавальнікаў. Што ўжо казаць пра маленькіх дзяцей?

— Перад вамі на асфальце ляжаць дзверы ад кабіны самага звычайнага грузавіка «МАЗ», — кажа адзін з ратаўнікоў. — Нават засталося, як бачыце, люстэрка задняга віду. Пасля дарожна-транспартных здарэнняў здараецца так, што нам даводзіцца вызваляць кіроўцаў і пасажыраў, якія засталіся ўсярэдзіне, з дапамогай гідраўлічных нажніц. І зараз мы пакажам, як гэта робіцца.

Вялізныя гідраўлічныя нажніцы прагрызаюць тоўсты метал хутка і ўпэўнена. Адзін надрэз, другі, трэці — і неўзабаве ў дзвярах з'яўляецца прамавугольная адтуліна. Тут жа ратаўнік перакусвае нажніцамі сталёвую трубку, на якой мацуюцца дзверы, з такой лёгкасцю, нібыта перад ім звычайны дрот. Наступны майстар-клас вучыць, як пацэліць магутным струменем вады ва ўяўны эпіцэнтр полымя (ролю якога выконвае звычайны валейбольны мячык).

Агонь патушаны!

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

А напрыканцы вучэнняў ратаўнікі прапанавалі адпрацаваць школьным настаўнікам на практыцы тушэнне сапраўднага пажару. Агонь яны развялі ў ночвах. Звычайна ж падобная падрыхтоўка абмяжоўваецца толькі тэарэтычным інструктажам, а вось як трэба працаваць у баявых умовах, калі адлік часу ідзе на секунды? І стаўка — жыцці вучняў?

— Дзякуючы гэтай акцыі нашы настаўнікі атрымалі практычныя навыкі карыстання вогнетушыцелямі, — падсумоўвае **дырэктар сярэдняй школы №112 Святлана ГАЛАЎНЁВА.** — Пакуль што сапраўднае полымя ім тушыць не даводзілася, і дзякуй Богу. Ды і мы мусім ствараць для дзяцей бяспечныя ўмовы ў школе і выхоўваць у іх адказнасць да ўласнай бяспекі. Школа ж для іх, па сутнасці, як другі дом. Тэарэтычныя веды — гэта, вядома, добра, а вось як паводзіць сябе ў крытычнай сітуацыі? Тут могуць дапамагчы толькі такія вучэнні, як гэтыя. І такія заняткі трэба праводзіць. Ды і дзецям яны спадабаліся — вы ж бачылі іх захапленне ад эфектнага відовішча, калі струмень ад вогнетушыцеля даставаў, здавалася, да неба. Вучні нашы пастаянна ўдзельнічаюць у шматлікіх прафілактычных акцыях МНС. У конкурсах малюнкаў і вырабаў займалі нават прызавыя месцы. І гэта таксама вельмі важны складнік, але вось такія рэалістычныя вучэнні застануцца ў іх памяці надоўга.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Жыццё начнога горада

НА ДЗЯЖУРСТВА З АЎТАПАТРУЛЁМ

выправіліся карэспандэнты «Звязды»...

Сёлета патрульна-паставой службе міліцыі Беларусі спаўняецца 95 гадоў. Але ці ведае большасць з нас, з якімі цяжкасцямі і непрадбачанымі сітуацыямі кожны дзень сутыкаюцца тыя, хто беражэ наш спакой? Карэспандэнты «Звязды» вырашылі пра гэта даведацца, заступіўшы на змену разам з супрацоўнікамі патрульна-паставой службы міліцыі ГУУС Мінгарвыканкама.

У ПАГОНІ ЗА ЭКШАНАМ

Аб тым, у які дзень тыдня лепш далучыцца да супрацоўнікаў ППСМ, пытанняў не ўзнікала. Негалосны закон гаворыць: добры «ўлоў» заўжды гарантуюць вечар пятніцы і выхадныя. Маўляў, людзі расслабляюцца пасля цяжкіх працоўных дзён і пачынаюць адпачываць, як хто на што здатны. На змену з аўтапатрулём у Маскоўскім раёне сталіцы мы з фотакарэспандэнтам «заступаем» у 21 гадзіну.

— Відаць, сёння будзе ціха. Надвор'е для «прыгод» не тое, — гледзячы ў акно службовай машыны, кажа **прапаршчык Павел БАРАДЗІН**, **міліцыянер 3-й роты палка ППСМ.**

Пра тое, што дождж можа паўплываць на працу супрацоўнікаў патрульна-паставой службы, нас не папярэдзілі. Як вынік, амаль дзве гадзіны цішыні. Тэлефон у дзяжурнай часці маўчыць, на вуліцах горада спакойна. Дарэчы, аўтапатруль, да якога мы далучыліся, заўсёды ў дарозе. За змену службовая машына можа праехаць каля 200 кіламетраў. Таму аўтапарк ППСМ увесь час абнаўляецца. Вось ужо тры гады патрульна-паставая служба ездзіць толькі на добра ўсім знаёмых «УАЗіках», цалкам спісаўшы старэнькія «жыгулі».

— «УАЗ» для працы ППСМ — самая добрая машына. Яна і ёмістая, і непераборлівая, і надзейная. А самае галоўнае — усюды пройдзе, — лічыць сяржант **Павел МЕЛЬНІКАЎ, міліцыянер-кіроўца 3-й роты палка ППСМ.**

Коней і веласіпеды таксама замянілі, але ўжо на скутары. Жывёлы аказаліся вельмі дарагім відам транспарту. Гэта датычыцца і куплі каня, і яго кармлення, і ўтрымання. Скутары куды больш эканамічныя і мабільныя.

— Разумею, вам экшану для матэрыялу хочацца, — звяртаецца Павел Барадзін, заўважыўшы мой сумны позірк, — але для нас такія дні на змене — рэдкасць, таму мы іх вельмі цэнім. Трэба было ўчора вам прыязджаць — шыбеніка знайшлі...

Павел Барадзін працуе ў патрульна-паставой службе ўжо пятнаццаць гадоў. Прапаршчык міліцыі прызнаецца, што за гэты час шмат чаго прыйшлося пабачыць. Былі і такія выпадкі, пра якія не тое што расказваць, а нават узгадваць не хочацца.

— Ніколі не забуду, як, ратуючы падлетка ад суіцыду, сам ледзь не загінуў. Хлопец ад нераздзельнага кахання са шматпавярховіка выкінуцца хацеў. Я пачаў яго адгаворваць. І здавалася, усё атрымалася, як раптам, паварочваючыся да мяне тварам, падлетак пакаўзнуўся і сарваўся ўніз. Я схапіў яго — і сам ледзь разам з ім не апынуўся на асфальце. На шчасце, калегі своечасова аказаліся побач, — расказвае міліцыянер.

Як паказвае практыка, моладзь усё радзей хуліганіць ці п'е піва на вуліцах. І гэта не можа не радаваць, прызнаюцца супрацоўнікі патрульна-паставой службы. Але тых, каго трэба ўціхамірыць, і без іх хапае. На тэлефон дзяжурнай часці прыходзяць званкі рознага зместу. Пералічыць усе проста немагчыма, але вылучыць найбольш папулярныя — можна.

— Часта прыходзіцца выязджаць да кампаній, якія пілі разам, а потым нешта не падзялілі і пачалі высвятляць адносіны кулакамі. Амаль ніводная змена не абыходзіцца без сямейнага скандалу. Шмат паведамленняў паступае пра тое, што дзесьці на вуліцы ляжыць чалавек, — гаворыць прапаршчык міліцыі. — Мы павінны адрэагаваць на кожны званок.

МАРА — ТРАПІЦЬ У «ЗОНУ Х»

«З кватэры скралі 3 мільёны рублёў, 150 еўра. Прыкметы злачынца: на выгляд 22-23 гады, адзеты ў сінія джынсы, цёмную куртку. Рост прыкладна 167 сантыметраў», — перадалі па рацыі. Мы з фотакарэспандэнтам ажывіліся: «Вось ён, той доўгачаканы выклік!» Але злачынства адбылося не на «нашай» тэрыторыі і на дапамогу паехаў іншы патруль.

— А ці шмат ілжывых выклікаў паступае? — цікаўлюся я.

— За такія «гульні» можна да 50 базавых велічынь штрафу атрымаць, таму ахвотнікаў развітацца з грашыма мала, — адказвае Павел Барадзін.

...На гадзінніку каля 23.00. Патруль ездзіць па знаёмых вуліцах, збочвае ў цёмныя двары дамоў. Тут, па словах супрацоўнікаў ППСМ, часта збіраюцца аматары піва. Вось і на гэты раз прафесійны позірк Паўла Сяргеевіча знаходзіць каля дзіцячай пляцоўкі двух «адпачывальнікаў». На пытанне, чаму распіваюць алкагольныя напоі ў грамадскім месцы, хлопцы толькі паціснулі плячыма. Прапаршчык міліцыі просіць паказаць дакументы.

— Вам, паважаны, трэба будзе праехаць з намі, — звяртаецца міліцыянер да мужчыны ў кепцы. — А вы можаце быць свабоднымі.

«З дому часта ўцякаюць хлопцы 14-16 гадоў. Пасварацца з бацькамі і пачынаюць ім нешта даказваць. Хаваюцца ў сяброў, едуць да бабулі, якая проста забывае патэлефанаваць бацькам».

Сябра затрыманага адпусцілі таму, што яго бутэлька з півам была закрытая. Відаць, толькі далучыўся да «стала».

— Хлопцы, я ж нічога дрэннага не рабіў! — спрабуе абурацца затрыманы. — Я зараз дадому пайду, абяцаю. Толькі дзе я жыву?

Каля 90% хуліганстваў і боек учыняюцца ў алкагольным ап'яненні.

Фота Надзеі БУЖАН.

Тых, хто парушае грамадскі парадак, дастаўляюць у найбліжэйшы гарадскі аддзел міліцыі для вызначэння асобы і высвятлення ўсіх абставін справы.

БЫЦЬ ЗАЎСЁДЫ НАПАГАТОВЕ

Другі працоўны дзень пачаўся таксама ўвечары, але на гэты раз мы ахоўвалі спакой Фрунзенскага раёна.

— А ці часта прыходзіцца рызыкаваць жыццём, трапляць у перастрэлкі? — пытаюся я.

— Рызыка ёсць заўсёды. Ты ніколі не можаш прадбачыць, як павядзе сябе чалавек. Расслабляцца нельга, нават калі перад табой ціхенькі пенсіянер ці сціплы падлетак. Напэўна, вы чулі пра тую страшную студзеньскую трагедыю паўтара года таму, калі ў перастрэлцы загінуў наш калега? Дык вось, злодзеем быў пажылы чалавек, да якога супрацоўнік ППСМ паставіўся з павагай, а той у адказ адкрыў агонь. Гэтая гісторыя навучыла ўсіх аднаму: быць заўсёды напагатове, — кажа **старшы лейтэнант Фёдар ЗНОСАК, камандзір узвода 8-й роты палка ППСМ.**

Сёння ў экіпіроўку аўтапатрулёў уваходзяць бронекамізэлькі і броняшлемы, якія забяспечваюць ахову ад куль. Пешыя нарады падобнай бранёй не забяспечваюцца: восем гадзін на сабе такую вагу не паносіш.

Прапаршчыку Уладзіміру ГРАМАДЗЕ, міліцыянеру 8-й роты палка ППСМ да пенсіі засталося тры гады. Уладзімір Пятровіч прызнаецца, што за працай нават не заўважыў, як хутка вырас сын. Апошні, дарэчы, таксама выбраў службу ў міліцыі.

— Працуем мы два дні праз два. Напрыклад, сёння заступілі на службу ў 17.00 — і да 5 гадзін ранку. Заўтра таксама, а потым два дні выхадных. Ці спім перад начной зменай? Стараемся, але, самі разумееце, хатнія клопаты ніхто не адмяняў, — усміхаючыся, кажа Уладзімір Грамада.

«На вуліцы збілі мужчыну і выкралі тэлефон», «Дзяўчына ў парку крычыць і просіць аб дапамозе», «Адшукваецца падлетак 14 гадоў. Апрануты ў спартыўны касцюм і красоўкі. Валасы светлыя, вочы блакітныя. Хлопец пайшоў з дому каля 14 гадзін. Месцазнаходжанне падлетка да гэтага часу невядома». Сёння па тэлефоне дзяжурнай часткі званкоў паступае значна больш, чым учора, «Адпачывальніка» даставілі ў найбліжэйшы гарадскі аддзел міліцыі. Там вызначаць яго асобу (бо пашпарта з сабой не было) і высветляць, ці «пападаўся» хлопец раней. Калі не — выпішуць штраф 0,5 базавай велічыні за распіццё алкаголю ў грамадскім месцы, калі так — пакаранне будзе ў выглядзе адміністрацыйнага арышту ці штрафу ад дзвюх базавых і больш.

— Я з ім на адной лаўцы сядзець не буду! Хто ён, а хто я?! — паказваючы на «нашага кліента» гаворыць такая ж пастаялка ГАМ. — Я ўвогуле не ведаю, што тут раблю. Была дома, нікога не чапала, і тут «прыляцелі», забралі, прывезлі сюды!

Супрацоўнікі ППСМ патлумачылі, што на «невінаватую» міліцыю выклікаў муж. Відаць, самастойна з п'янай жонкай справіцца не змог. Дарэчы, амаль кожнае хуліганства, бойка здзяйсняецца ў алкагольным ап'яненні. На светлую галаву, як кажуць міліцыянеры, рукі, відаць, не так свярбяць.

— А ты мяне фатаграфуеш? — звяртаецца да фотакарэспандэнта наш адпачывальнік. — Здымай-здымай, я нават папазіраваць магу. Заўсёды марыў у гэтую крымінальную перадачу «Зона Х» трапіць!

На гэтым жаданні стаць «вядомым» наша змена з фотакарэспандэнтам скончылася: у супрацоўнікаў раптоўна пачаліся агульнагарадскія вучэнні. Чакаць «калег» мы не сталі і вырашылі дапрацаваць сваё заўтра.

Старшы лейтэнант Фёдар ЗНОСАК, камандзір узвода 8-й роты палка ППСМ ГУУС Мінгарвыканкама, правярае, як працуе пешы патруль.

але ўсе яны не адносяцца да нашага ўчастка.

«Часта прыходзіцца выязджаць да кампаній, якія пілі разам, а потым нешта не падзялілі і пачалі высвятляць адносіны кулакамі. Амаль ніводная змена не абыходзіцца без сямейнага скандалу».

— Шмат людзей знікае? — цікаўлюся я. — Дзе іх перш за ўсё трэба шукаць?

— З дому часта ўцякаюць хлопцы 14-16 гадоў. Пасварацца з бацькамі і пачынаюць ім нешта даказваць. Хаваюцца ў сяброў, едуць да бабулі, якая проста забывае патэлефанаваць бацькам і супакоіць, што з іх дзіцем усё добра. Шукаць даводзіцца і мужоў, якія проста загулялі, а жонкі ўжо забілі трывогу, што прапаў, — узгадвае Фёдар Зносак.

Што датычыцца крадзяжоў, то тут мішэнямі часцей за ўсё становяцца п'яныя і дзяўчаты, якія трымаюць свае сумачкі, што называецца, «адным пальцам».

«ДАСТАЛА ЯНА МЯНЕ!»

«Нажавое раненне. Жанчына, 45 гадоў», — перадалі па рацыі. **Міліцыянер-кіроўца 8-й роты палка ППСМ Уладзімір МІЦУРА** збочвае на вуліцу, дзе знаходзіцца дом, у якім адбылося злачынства. Паднімаемся на другі паверх, дзверы 45-й кватэры насцеж, на падлозе відаць невялікія кроплі крыві.

— Дастала яна мяне! — кідае раз'юшаны муж у адрас жонкі. — Усё вучыць, папракае. 18 гадоў разам пражылі, а яна ніяк супакоіцца не можа! — дадае мужчына гадоў 50.

Да параненай жанчыны, у нагу якой паляцеў кухонны нож, накіроўваюцца медыкі «хуткай дапамогі». Пашчасціла: рана неглыбокая. Гаспадыня кватэры ўвесь час маўчыць, нават не адказвае на пытанні міліцыянераў.

— У яе шок, — тлумачыць Уладзімір Грамада. — Неўзабаве пацярпелая загаворыць, але разбірацца будзем ужо ў аддзеле міліцыі. Зразумела, што муж добра выпіў сёння, мабыць, гэта і падліло масла ў агонь.

Тое, што блізкія людзі, на жаль, часам становяцца самымі сапраўднымі ворагамі, пацвярджае сумная гісторыя з практыкі Фёдара Зноска. Ён узгадаў, як маці выкінула сваё трохгадовае дзіця з даху аднаго з дамоў у сталіцы. За ім і сама гора-маці скокнуць хацела, яле ўбачыла, як гэта страшна, і не змагла забіць сябе. Прычына такога ўчынку — вялікія даўгі.

— Праца ў супрацоўнікаў патрульна-паставой службы цяжкая. Не вельмі прыемна кожны дзень бачыць менавіта такі бок жыцця. А ў вас, — звяртаюся да Уладзіміра МІЦУРЫ, самага маладога байца ў нашай змене, — напэўна, размеркаванне?

— Не, гэта мой усвядомлены выбар, — упэўнена адказвае міліцыянер-кіроўца. — Я ўжо тры гады ў патрульнай службе і, калі б зразумеў, што не маё, даўно сышоў бы. Увогуле, я па прафесіі эканаміст-менеджар, але служба ў міліцыі мне падабаецца больш.

Да канца змены застаецца тры гадзіны. Мы з фотакарэспандэнтам вырашаем адправіцца дадому — напрацаваліся.

— Заходзьце да нас яшчэ, — кажа Фёдар Зносак. — Вы неяк добра на спакой у горадзе ўплываеце *(усміхаецца)*. — Мабыць, гэта супадзенне, але такіх ціхіх змен я даўно не памятаю.

Мы падзякавалі за запрашэнне, але пра сябе падумалі, што, напэўна, гэта не наша. Уражанняў і страшных гісторый, атрыманых і пачутых за два дні, хопіць на ўсё жыццё.

Кацярына АСМЫКОВІЧ

Амаль ніводная змена не абыходзіцца без сямейнага скандалу.

Заўсёды на ахове спакою

Віталь НІЛАЎ, першы намеснік камандзіра палка ППСМ ГУУС Мінгарвыканкама — начальнік штаба, падпалкоўнік міліцыі:

— На тэрыторыі Мінска праглядаецца тэндэнцыя зніжэння вулічнай злачыннасці. У першую чаргу гэта тычыцца крадзяжоў і рабаванняў. За апошнія 8 месяцаў іх стала на 20 працэнтаў менш у параўнанні з мінулым годам. Супрацоўнікі ППСМ сумленна берагуць спакой сталіцы, пра што гавораць не толькі жыхары Мінска, але і замежныя госці горада. Вядома, на кожную вуліцу паставога мы не ставім. Але гэтага і не трэба. Патруль працуе ў найбольш крымінагенных месцах, у самы напружаны час. Больш за тое, супрацоўнікі ППСМ заўсёды курсіруюць, што дазваляе ахапіць большую тэрыторыю. Акрамя гэтага, разам з патрульна-паставой службай парадак на вуліцах горада забяспечваюць нарады ўнутраных войскаў, экіпажы дарожна-патрульнай службы ДАІ. Гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што і буйны горад можа быць бяспечным. Адзінае, хацелася б звярнуцца да грамадзян з просьбай паведамляць аб правапарушэнні адразу, як яно адбылося. Па статыстыцы, калі званок у дзяжурную частку паступіў у найбліжэйшыя 10-15 хвілін, верагоднасць раскрыцця злачынства дасягае 70 працэнтаў. Узаемадзейнічаючы, значна лягчэй зрабіць горад спакойным і ўтульным.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА НА ПЕРЕДАЧУ В АРЕНДУ ОХОТНИЧЬИХ УГОДИЙ ФОНДА ЗАПАСА

Лепельский районный исполнительный комитет Витебской области, по поручению Витебского областного исполнительного комитета
16 октября 2015 года в 15.00
в здании районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: ул. Ленинская, 6, г. Лепель,

ПРОВОДИТ ТОРГИ В ФОРМЕ АУКЦИОНА
НА ПЕРЕДАЧУ В АРЕНДУ ОХОТНИЧЬИХ УГОДИЙ
со сроком аренды не менее 10 лет

На торги выставляются охотничьи угодья общей площадью 5972 га, в том числе лесных 3852 га, полевых 1880 га, водно-болотных 240 га, находящиеся в фонде запаса охотничьих угодий Лепельского района в следующих границах:

западная – от квартала 58 далее по границе лесничества квартала 3;

северная – от квартала 3 Лепельского военного лесничества по северной границе лесничества до дороги из д. Новоселки;

восточная – от дороги из д. Новоселки по восточной границе лесничества до железной дороги Орша–Лепель;

южная – по железной дороге Орша – Лепель до западной границы квартала 65 и по ней до реки Улла. По реке Улла на запад до юго-западного угла квартала 58.

Начальная цена объекта торгов 15 775 200 (пятнадцать миллионов семьсот семьдесят пять тысяч двести) рублей.

Претенденты на участие в аукционе с объектом аукциона знакомятся самостоятельно.

Для участия в аукционе в срок **до 13 октября 2015 г. до 15 часов 00 минут** необходимо предоставить комиссии по проведении торгов по адресу: г. Лепель, ул. Ленинская, 6, каб. 226 следующие документы:

- заявление об участии в торгах;
- доверенность представителя участника торгов и копии документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов;
- биолого-экономическое обоснование на испрашиваемые в аренду охотничьи угодья, разработанное в соответствии с требованиями законодательства;
- заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет **3641319001105 ЦБУ № 211 ф-ла 214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, УНП 300039625, ОКПО 040626632000.** Задаток вносится в размере 20 (двадцати) % начальной цены объекта аукциона 3 155 (три миллиона сто пятьдесят пять) рублей, который вносится не позднее 5 дней до проведения торгов.

Кроме этого участник, выигравший торги в течение 5 дней с момента подписания протокола проведения торгов, возмещает затраты на организацию и проведение торгов. Сумма затрат и порядок их возмещения доводится до сведения участников торгов до начала их проведения в день проведения торгов.

Договор с победителем аукциона заключается Витебским областным исполнительным комитетом в сроки, установленные законодательством.

Контактный телефон – 8-02132 41382, факс – 8-0213248074.

Комиссия по проведению торгов.

СА «ЗВЯЗДОЮ» — СПАДРУЧНЕЙ!

ПРАЛЬНАЯ МАШЫНА LG

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2015 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце
ДА 14 КАСТРЫЧНІКА 2015 ГОДА
ў рэдакцыю на адрас:
220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 15.10.2015 года будзе разыграна 7 прасаў Bosch і суперпрыз — пральная машына LG. Вынікі апублікуюць у газеце «Звязда» да 25.10.2015 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2015 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2015 г. і пашпарта.

Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» чытайце ў нумары 174 газеты «Звязда» ад 11.09.2015 г.

Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.
ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 12.09.2015 ПА 31.12.2015.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2619 ад 11.09.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь

КАБ НЕ СУМАВАЦЬ У ЛІСТАПАДЗЕ

Спадзяёмся, што сярод штодзённых ураджайных клопатаў вы не забыліся, што ідзе падпіска на IV квартал. Напярадзе самыя самотныя доўгія вечары, а хто дапаможа іх правесці нясумна і цікава, як не любімая газета? Мы пастараемся, каб вам штодня было што пачытаць, абмеркаваць з блізкімі, над чым задумацца. Цёплая коўдра, гарачая гарбата і газета, якая не дае нудзіцца, — што яшчэ патрэбна ў ранніх прыцемках лістапада?

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2015 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
_____ на IV кв. 2015 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 28 сентября 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	**«Здание гаража» общей площадью 228,6 кв. м, инв. номер 200/С-53207, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 30Г; «кирпичное здание» общей площадью 28,3 кв. м, инв. номер 200/С-87802, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 30Г/1 (составные части и принадлежности: подвал, ограждение, ворота, покрытие, здание).**
Сведения о земельном участке	Площадь – 0,0721 га, кадастровый номер 240100000001000588, целевое назначение – для обслуживания гаражей
Продавец имущества	ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», г. Минск, ул. Казинца, 121А, к. 327
Организатор торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	500 000 000 белорусских рублей
Сумма задатка	50 000 000 белорусских рублей
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2,4 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **28 сентября 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 16.09.2015 по 24.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»).

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**Агроторговое унитарное предприятие «Нива-ЗОС», Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Я. Коласа, 80**
Месторасположение предмета аукциона	**Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80**

Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)

Инвентарный номер	Наименование	Назначение	Общая площадь	Адрес (№ дома)
443/С-18701	**Здание кафе «Купалинка»**	Здание специализированное для общественного питания	1633,1 кв.м	ул. Якуба Коласа, 80Б
*Составные части и принадлежности:		Летнее кафе 50,6 кв.м, покрытие (из тротуарной плитки) 242 кв.м, покрытие (асфальтобетонное) 1103 кв.м, ворота		
443/С-18699	**Столовая на 450 мест 2-этажное здание**	Здание специализированное для общественного питания	2475 кв.м	ул. Якуба Коласа, 80Б/1
443/С-16562	**Складское помещение**	Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ	202,8 кв.м	ул. Якуба Коласа, 80Б/3
*Составные части и принадлежности:		Ворота, калитка		
443/С-16561	**Навес (с ямой)**	Сооружение специализированное складов, хранилищ	161,2 кв.м	ул. Якуба Коласа, 80Б/2

В состав предмета аукциона входят: **здания сборно-разборные (**павильон-шатер, павильон «Одуванчик», навес торговый), **оборудование кафе и столовой в количестве 137 единиц** (в соответствии с перечнем оборудования, размещенного на сайте организатора аукциона **www.cpo.by).**

Начальная цена с НДС 20% – 21 611 264 106 белорусских рублей.

Сведения о земельном участке:	Для размещения объектов общественного питания продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **0,5531 га.**

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи:	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Дата и время проведения аукциона	**19.10.15 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Дата и время окончания приема документов	**16.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by**

Печать и свидетельство о государственной регистрации ЧТУП «Номид» (УНП 190977359) **считать недействительными в связи с утерей**.

УНП 191903970

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Организатор: Волосовичский сельский исполнительный комитет

№ лота	Местонахождение земельного участка	Площадь га, кадастровый номер	Условия и организация	Расходы по подготовке и изготовлению документов (руб.)	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
У-3	д. Каминщина Лепельского района	0,1500 га Кадастровый номер 222780404101000017	- водоохранная зона озера Турицкое	5 891 559	5 000 000	1 000 000
У-4	д. Каминщина Лепельского района	0,1500 га Кадастровый номер 222780404101000018	- водоохранная зона озера Турицкое	4 436 696	5 000 000	1 000 000
У-5	д. Каминщина Лепельского района	0,1486 га Кадастровый номер 222780404101000019	- водоохранная зона озера Турицкое - расположен в охранной зоне линий электропередачи	4 391 115	5 000 000	1 000 000

1. **Аукцион состоится 26 октября 2015 года в 15.00** по адресу: Витебская область, Лепельский район, д. Новые Волосовичи, улица Центральная, дом 17.

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: д. Новые Волосовичи, улица Центральная, дом 17, Волосовичский сельский исполнительный комитет. **Последний день приема заявлений – 23 октября 2015 года до 17.00.**

3. *К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Волосовичского сельисполкома № 3600319030032 в филиале №211 ЦБУ №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, УНП 300039732, назначение платежа 04901, задатка в размере 10% от начальной цены объекта аукциона.*

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, подтверждающего личность покупателя, представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, за публикацию в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8(02132) 6-39-63; 6-11-99; V 8-0291-333-105.

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Славная осень»

1. Настоящая рекламная Игра называется **«Славная осень»** (далее по тексту – игра или рекламная игра), проводится в соответствии с условиями настоящих Правил (далее по тексту – Правила) с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

2. **Организатором** Игры является Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор).

Юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43.
Адрес офиса: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43.
Почтовый адрес для писем: а/я №39 г. Минск, 220050 с пометкой «Славная осень» УНП 100843219, зарегистрировано Решением Мингорисполкомом от 2 декабря 2008 года.

Заинтересованным лицом является Открытое акционерное общество «Молочные горки» (далее – Заинтересованное лицо), 213410, Могилевская область, г. Горки, ул. Мира, д. 19, УНП 700101290.

3. Игра проводится **в период 21 сентября 2015 года – 23 ноября 2015 года** на территории Республики Беларусь.

4. **Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

Председатель комиссии:

Титова Татьяна Ивановна – заместитель директора по юридическим и кадровым вопросам ОАО «Молочные горки»

Члены комиссии:

Салманова Анастасия Саррафовна – специалист по маркетингу ООО «Славяна»

Черненков Павел Леонидович – индивидуальный предприниматель управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс»

Богдусевич Ирина Сергеевна – и.о.начальника отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»

Филина Валентина Валерьевна – специалист отдела продвижения товаров и услуг ЗАО «Сэлмон-Графикс»

Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа-Крама».

5. **Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:**

Рекламная игра проводится в целях увеличения объемов продаж всей продукции торговой марки «Славяна».

6. **Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником рекламной игры:**

6.1 Участником Игры может стать лицо, достигшее 18 лет и постоянно проживающее на территории Республики Беларусь (в том числе имеющее вид на жительство в РБ). Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

6.2 Для участия в рекламной игре «Славная осень» необходимо приобрести любые 3 единицы продукции ТМ «Славяна» в любой торговой точке на территории Республики Беларусь и в срок с 21 сентября 2015 г. по 31 октября 2015 г. (дата отправки определяется по почтовому штампу отправления), отправить 3 логотипа от вышеуказанной продукции одним письмом на абонентский ящик № 39 Минск 220050 с пометкой «Славная осень». В письме должны содержаться также сведения об участнике Рекламной Игры:

ФИО (полностью);
возраст;
род деятельности (студент, рабочий, служащий, безработный, пенсионер);
адрес прописки и адрес проживания (почтовый адрес с индексом);
телефон(ы) для связи.

В игре принимают участие письма, полученные Организатором до 05 ноября 2015 г.

6.3 Каждый участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз при условии выполнения требований, необходимых для участия в Игре.

